

*Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі* ☞ 3


# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714




*Фестывальная мазаіка* ☞ 9


http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl



№ 23 (2717) Год LIII | Беласток, 8 чэрвеня 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)


# Жыццё з мастацтвам і паэзіяй

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

**Юбілей 85-годдзя з дня нараджэння народнага мастака і паэта з Крывой Анатоля Краўчука стаў добрай нагодай для вернісажу яго алейных карцін, прэзентацыі аўтарскіх вершаў і невялікага канцэрта ў гонар юбіляра. Святкаванні адбыліся 30 мая ў Музеі малой айчыны ў Студзіводах.**

Супрацоўніцтва паміж Анатолем Краўчуком і Студзіводскім музеем пачалося з мая 2002 года, калі жывапісец першы раз прэзентаваў у скансэне свае працы.

— Анатоль Краўчук у час ладжаных у музеі летнікаў вучыў маляваць і рабіць папяровыя фіранкі. Ён вельмі добры чалавек, любіць займацца з дзяцьмі і ўсім стараецца дапамагаць, — расказала Марыя Сцепанюк са Студзіводаў. Старшыня музейнага аб'яднання Дарафей Фіёнік адзначыў, што юбіляр сваімі карцінамі, вершамі і звычайнымі паводзінамі вучыць любіць сваю малую айчыну, вучыць пашаны да другога чалавека, захоўваючы пры гэтым сціпласць.

— Паміж Анатолем Краўчуком і нашым музеем завязалася цеснае супрацоўніцтва. Калі ён убачыў, што наш фестываль адбываецца пад адкрытым небам, даў матэрыял са свайго лесу на сцэну і дах, а таксама на падрубы пад мяшчанскі дом, — заявіў Дарафей Фіёнік, які адкрыў мерапрыемства і вёў яго разам з жонкай Альжбетай. Перад сабранымі з мясцовымі песнямі выступіў калектыў „Жэмэрва", царкоўную музыку і свецкія песні прэзентаваў Камерны армянскі хор з Масквы, які на Міжнародным фестывалі „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі" заняў самае высокае месца ў катэгорыі прафесійных калектываў. Не толькі моладзь з „Жэмэрвы", але хлопцы і дзяўчаты запрашалі публіку да народных танцаў. Вершы Анатоля Краўчука дэкламавалі Юлянна Дораш і Кацярына Завадская з тэатральнага калектыву „Антракт" Бельскага дома культуры.

— Самыя вартасныя вершы спадара Анатоля напісаны на сваёй мове, — заявіў Дарафей Фіёнік. У невялікім альбоме, выдадзеным Студзіводскім музеем з дапамогай мясцовых самаўрадаў, змясціў ён таксама вершы народнага паэта напісаныя на гаворцы вёскі Крывая. Аднак у гэтым альбоме самае важнае месца займаюць рэпрадукцыі алейных карцін Анатоля Краўчука. Некаторыя з іх эксапанаваліся ў выставачнай зале і другіх памяшканнях музейнай студзіводскай хаты. Можна там убачыць работы, што выйшлі з-пад пэндзля



*Побач юбіляра Анатоля Краўчука героямі мерапрыемства былі яго жонка Вольга, вучаніца Кася Нікалаюк і ўнучка Эліза Краўчук (справа)*

Анатоля Краўчука на працягу апошніх 30 гадоў. Узрушаны юбіляр дзякаваў Богу за жыццё і талент, а добрым людзям за дапамогу, асабліва Дарафею Фіёніку і арганізатарам юбілейнага мерапрыемства.

— Ужо некалькі разоў муж зараклася, што не будзе маляваць, але, калі ўбачыў прыгожыя краявіды, не мог вытрываць без пэндзля і фарбаў ды браўся за работу, — удакладніла жонка юбіляра Вольга Краўчук. — Вершы муж любіць пісаць раніцай, а малюе ў вольны час.

— Наш юбіляр надалей з'яўляецца плённым мастаком, — адзначыў Дарафей Фіёнік. — Дзень да мерапрыемства закончыў ён карціну „Вяселле".

Аднак на выстаўцы найбольш было ландшафтнага жывапісу, натхнёнага прыгажосцю наваколля Крывой. На экспазіцыі былі таксама працы сакральнага, праваслаўнага характару і аўтапартрэты мастака.

— Тэхніка ў Анатоля Краўчука добрая. На працах відаць удалае панарамічнае адлюстраванне рэчаіснасці. На карцінах свежыя колеры, якія прыбліжаюць работы да натуры і робяць іх больш цікавымі, — заявіў гайнаўскі мастак Віктар Кабац. Яго меркаванні аказаліся згоднымі з поглядамі гісторыка мастацтва Івоны Марціновіч-Якімюк, якая звярнула ўвагу на пошукі прыгожасці аўтарам з выкарыстаннем разнародных колераў.

— Палотны Анатоля Краўчука жывуць хвілінай, кожнай парой года. Манера малявання шырокімі экспрэсіўнымі мазкамі пэндзля стварае фактуры, адбіваючы рэфлексы святла, — удакладніла мастацтвазнаўца Івона Марціновіч-Якімюк.

Арганізатары мерапрыемстваназнаёмілі публіку таксама з вучаніцай юбіляра Кацярынай Нікалаюк, якая якраз вучыцца ў Мастацкім ліцэі ў Супраслі. Пачынала яна маляваць пад наглядам Анатоля Краўчука, а зараз яе спецыяльнасцю з'яўляецца ткацтва. Адна з работ Касі, якая паказвае асеннія дрэва, таксама прэзентавалася на выстаўцы. Больш работ на студзіводскай экспазіцыі прэзентуе ўнучка юбіляра Эліза Краўчук. Успамінала яна сваё першае маляванне пад апекай дзеда Анатоля ў 5-6-гадовым узросце.

— Успаміны з майго малявання ў дзяцінстве напамінаюць пах тэрпенціну. Мой дзядуля быў маім першым настаўнікам у галіне мастацтва. Пасля я закінула маляванне і вярнулася да мастацтва ў час вучобы на факультэце мастацкай педагогікі Падляшскай акадэміі ў Седльцах. Хаця мне падабаюцца карціны майго дзядулі, яго колеры і мазкі пэндзля, я пайшла ў іншым напрамку. Мае працы не тычацца таго, што я бачу, але таго, што адчуваю, — заявіла Эліза Краўчук. — На студзіводскую выстаўку прывезла я 5 графік і некалькі работ выкананых тэхнікай сухой іголкі, на якіх паказваю мае сюррэалістычныя ўяўленні.

Кветкі, падарункі і пажаданні атрымаў юбіляр Анатоль Краўчук ад арганізатараў сустрэчы са студзіводскага музея, войта Бельскай гміны Раісы Раецкай і прыхільнікаў ягонай творчасці. Сустрэча закончылася пачастункам і бяседай з юбілярам.

— Нашае мерапрыемства ладзіцца ў рамках святкавання „Дзён Бельска-Падляшскага" і з'яўляецца вестуном нашага фестывалю „Там по маёвуй росі", які неўзабаве адбудзецца, — сказаў старшыня музейнага аб'яднання Дарафей Фіёнік, запрашаючы на студзіводскі фестываль.


*Любімы мой горад...* ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

У Гродна я закахаўся адразу як прыехаў у гэты горад першы раз. І вось ужо больш дваццаці гадоў лічу сябе гродзенцам. Гэты ўтульны і зялёны горад мог прывабіць кожнага веліччу сваіх гістарычных будынкаў, сваёй старадаўнасцю і гісторыяй, Нёманам і музеямі, шчырымі ўсмешкамі жыхароў. Сённяшнія гродзенцы гэта людзі, якія прыехалі з розных куткоў Беларусі...

*Пра Беларусь у Торуні* ☞ 5

Ілона КАРПЮК





*Прэзідэнцкае захапленне* ☞ 12

Мацей ХАЛАДОЎСКІ




## ЗАПРАШЭННЕ

**Праграмная рада тыднёвіка „Ніва", Радыё „Рацыя" і Падляшская ксёнжніца запрашаюць на сустрэчу з беларускімі літаратарамі**

**Уладзімірам Арловым, Лявонам Баршчэўскім, Андрэем Хадановічам і Уладзімірам Някляевым,**

**прымеркаваную да выхаду на польскай мове анталогіі беларускай паэзіі XV-XX стагоддзяў. Сустрэча адбудзецца 17 чэрвеня 2008 г. (аўторак) а гадз. 18⁰⁰ у вялікай зале Падляшскай ксёнжніцы ў Беластоку, вул. Кілінскага, 16.**



# Любімы мой горад...

*У Гродна я закахаўся адразу як прыехаў у гэты горад першы раз. І вось ужо больш дваццаці гадоў лічу сябе гродзенцам. Гэты ўтульны і зялёны горад мог прывабіць кожнага веліччу сваіх гістарычных будынкаў, сваёй старадаўнасцю і гісторыяй, Нёманам і музеямі, шчырымі ўсмешкамі жыхароў. Сённяшнія гродзенцы гэта людзі, якія прыехалі з розных куткоў Беларусі. Але адкуль бы не прыязджалі сюды людзі, яны адразу станавіліся патрыётамі свайго горада. Так было заўсёды. Ды вось апошнім часам усё больш сустракаеш гродзенцаў, якія пачынаюць расчароўвацца ў сваім горадзе. Некаторыя нават не ведаюць чаму.*

*Зразумела, што закаханых у старажытны і непаўторны воблік Гродна не магло, мякка кажучы, узрадаваць тое, што па гістарычнай частцы праехаўся бульдозер і наблізіў выгляд абласнога цэнтра Гродзенскай вобласці да выгляду іншых абласных цэнтраў. Не натхніла карэнных жыхароў і знішчэнне парку на Савецкай плошчы, без якога ўвогуле многія не ўяўляюць аблічча сваёй малой радзімы. Не цешыць і руйнаванне прыватных дамоў, якія вабілі вока зелянінай садоў. Але ўсё гэта хіба не галоўнае, бо ў Гродне за апошнія гады шмат чаго ўпарадкавана, шмат чаго зроблена з густам, што ацэньваюць станоўча як кожны жыхар, так і турысты. Дык у чым жа тады справа? Чаму гродзенцы пачынаюць расчароўвацца ў сваім горадзе?*

*Некалькі дзён таму наведаў я Вільню. Цікава было параўнаць яе з маім горадам. Вузкіх вуліц цяперашняй сталіцы Літвы ніхто не пашырае, але аўтамабільных затораў я там чамусьці практычна не бачыў. У нас вуліцы шырокія, прасторныя, ды вось ездзіць па іх практычна немажліва. Хутчэй пешшу дойдзеш. Якая розніца, шырокая вуліца, ці вузкая, але калі зачынены мост праз Нёман, яна вядзе ў тупік. Як і ўсё, што ў нас робіцца.*

*Не бачыў я ў Вільні такой колькасці міліцыянтаў на дарогах, як у нас. І хоць прэзідэнт Літвы асабіста не займаецца правіламі дарожнага руху, павага шафёраў і пешаходаў адзін да другога відавочная.*

*Ходнікі нават у цэнтры Вільні засталіся такімі, як калісьці іх змайстравалі. Калі камяні паклалі дзвесце год назад, то яны там ляжаць і зараз, калі, канешне, не знасіліся. Калі нешта было зроблена ў савецкі час, то ніхто таксама не спяшаецца гэта перарабляць. Кажуць, як стане непрыгодным для карыстання, тады і памяняецца. А выкідваць грошы дзеля паказухі ніхто не збіраецца, бо грошы павінны служыць людзям, кожнаму жыхару горада, які за кошт падатковых выплат і стварае казну.*

*Ну а будынкі сівой даўніны там — гэта святое. Ніхто іх не руйнуе. У нас кладуць паўсюдна новую костку на ходніках. А там грошы ўкладваюць у рэстаўрацыю старадаўняй Вільні. Сцвярджаюць, што гэта станоўча ўплывае не толькі на павелічэнне колькасці турыстаў, але, што самае галоўнае, і на выхаванне патрыятычнага духу маладых віленцаў. Каб яны шанавалі і ганарыліся сваім горадам.*

*Нават з маладымі прадаўшчыцамі, якія не вучылі ў школах іншых моў, але вучылі сваю родную, заўсёды дамовішся, не ведаючы ані слова па-літоўску. І ўдзячныя госці горада кажуць ім „ачу", „віса гярэ" і „лаба дэна", везучы з сабой дахаты няхітры набор слоў на літоўскай мове.*

*У Гродне слова „дзякуй" практычна не пачуеш. У лепшым выпадку „спасибо". Ды і ўвогуле амаль нічога не пачуеш па-нашаму. Русіфікацыя тут дасягнула сваёй найвышэйшай кропкі. Надпісы, рэклама — усё па-руску. Вось і зараз, напярэдні святкавання дня нацыянальных культур, пры ўездзе ў горад з'явіўся вялікі надпіс „Гродно 880 лет". А можа ён з'явіўся ўвогуле не для турыстаў, бо прыязджае ў Гродна сам прэзідэнт. Можа таму зноў, як і перад мінулым прыездам, заасфальтоўваюць люкі, кладуць новенькі асфальт на нядаўна пакладзены новенькі асфальт. Усё, каб дагадзіць аднаму чалавеку. А дзіры ў дварах так і застаюцца дзірамі. Ніхто іх не засыпае і не збіраецца дагаджаць тым, хто там жыве. А тыя, хто там жыве, маўчаць. Маўчаць як рыбы, ці як рабы. І нічога не могуць зрабіць. Проста, перастаюць паважаць сябе і іншых. І становяцца незадаволенымі тым месцам, дзе жывуць. Хоць справа зусім не ў горадзе, які па-ранейшаму працягвае падабацца турыстам.*

**Віктар САЗОНАЎ**

# Горкая праўда



*Гартаючы архіўныя выразкі „Нівы", спыніўся я на допісе Грышы Мароза „Трымайся, Валодзя!". Было гэта пасля таго, як у 1983 годзе друкаваўся мой допіс „На раздарожжы". „Што ж ты задумаў? Пакінуць пісаць? — пытаў тады сябра. — Па столькі гадах супрацоўніцтва з „Ніваю"? (...) А хто на з'езд прыедзе? Гэта будзе не па-нашаму, не па-беларуску".*

*З Грышам сустрэліся мы на святкаванні 50-годдзя „Нівы" ў Беластоку. І тады нічога не прадказвала, што рашыцца ён парваць супрацоўніцтва з тыднёвікам. Праўда, рэдка дасылаў ён тэксты ў рэдакцыю, але вестка, якую пачуў я ад прыяцеля 17 траўня, дашчэнту мяне ашарашыла. Грыша Мароз не будзе пісаць у „Ніву"! Не цікавіцца нават, што зараз у ёй пішуць. Сам мне ў гэтым прызнаўся. Тлумачэнне, што быццам бы праблему стварае яму запаўнянне фармуляраў для разліку з казначэйскай установай, якія тычацца аўтарскага ганарару, здаецца быць непраўдзівым аргументам. Задумваюся затым і стаўлю пытанне чаму выкрышваецца ніўскі „авангард". Мікалай Панфілюк сціх. Калісьці лічыўся лідэрам у крузе карэспандэнтаў. Хоць сімпатыкі прызывалі яго да далейшай публіцыстычнай дзейнасці, але ён маўчыць. Не паказвае знаку жыцця. Выходзіць, што мы з Лук'янюком засталіся вернымі сваім ідэям. Праўда, пачалі дасылаць свае тэксты Пётр Байко з Белавежы, Жэня Мартынюк з Бельска-Падляшскага і Рута з Трасцянкі, але гэта капля ў моры таго, што даўней пісалі. Чаму ж так дзеецца, даражэнькія? У чым праблема? Адказ на пытанне знайшоў я ў тэксце Міры Лукшы „Алесь Свісёк — ад самага пачатку" („Ніва" № 19 ад 11 мая). Аказваецца, што падобны крызіс праходзіць „белавежац", паэт Аляксандр Батура. Так ён пракаментаваў сваю адсутнасць: „Я не пішу будзе з дзесяць гадоў. Не хочацца мне прызнацца, чаму... Скажу. Падчас пабыўкі ў Мінску (...) у адным магазіне прадаўшчыца на мяне гыркнула: „Гаварыце чалавечым языком!" (...) Мне надта я цяжка было гэтае перажыць. Адчуў такую безнадзейнасць беларускай справы. Не даў рады пісаць". Такую ж безнадзейнасць пэўна бачаць многія з нас. Мне, напрыклад, у час вандровак па Камянеччыне траплялася быць сведкам падобных здарэнняў. Хоць знаходзіўся я ў суверэннай Беларусі, не пачуў там слова на роднай мове. Адно маёр на пагранпераходзе ў Пяшчатцы сустрэў словамі „добры дзень", а на развітанні сказаў „да пабачэння". У райвыканкаме чыноўнікі, як і прадаўцы ў крамах, штодзень размаўляюць па-руску. Праўда, ніхто мяне не папракнуў, што карыстаюся „нечалавечай" гаворкай, але мае суразмоўцы неяк дзіўна глядзелі на мяне ў час размовы. І мае сямейнікі, якія пражываюць у Вярховічах, Долбізне ці ў Юсічах таксама рускай мовай карыстаюцца, хоць цётка з дзядзечкам гавораць яшчэ „па-апацку". Відаць, у недалёкай будучыні і ў нашай Малой айчыне, на Падляшшы, загіне мясцовая гаворка, бо маладое пакаленне адракаецца ад сваіх каранёў, ад сваёй тоеснасці. Адыдзе з ходам часу традыцыя і культура карэннай грамадскасці. Папулярныя беларускія імёны пэўна заменяць польскімі, Ніны будуць клікаць Янінамі, Валікаў — Вальдэкамі. Ці знойдзецца тады апраўданне для слоў Міры Лукшы, якая свайму суразмоўцы сказала: „Мы... трымаемся неяк на Беласточчыне"? Ці гэтае „трымаемся" не з'яўляецца агульнавядомым змаганнем Дон-Кіхота з ветранымі млынамі? Хто зараз з беларускай меншасцю лічыцца? Мясцовыя самаўрады (пачынаючы з Маршалкоўскай управы па войтаў гмін)? Скажаце, што дзяржава дала закон меншасцям. Маем беларускамоўную газету і слухаем перадачы на роднай мове. Можам пакарыстацца таксама двухмоўнымі назвамі мясцовасцей. Але што з гэтага закону, калі нашы абраннікі, войты ды бурмістры даюць дрэнны прыклад. А што з нашай „Нівай"? Калісьці хоць прысылалі адказы на крытыку. Зараз пісаніна застаецца безвыніковай. Ніхто не бачыць праблемаў тутэйшай меншасці. Аратары з вярхушкі прыпамінаюць аб нашым існаванні тады, калі прагаласаваць на іх трэба.*

*Вось, даражэнькія, як справы маюцца. Сумная і горкая гэта праўда, але як жа красамоўная рэчаіснасць. Варта затым задумацца над сваёй будучыняй. Старэйшаму пакаленню няшмат засталося гасцяваць на гэтай зямлі. Нашым дзецям і ўнукам прыйдзецца затым даказваць у будучыні, што з'яўляюцца яны часткай даўнейшай тутэйшай грамадскасці, а не іншапланецянамі.*

**Уладзімір СІДАРУК**

**Вачыма еўрапейца**

# Дванаццаць умоў



*Гэты лозунг варта памятаць прынамсі на працягу найбліжэйшых гадоў: „Усходняе партнёрства Еўрапейскай палітыкі суседства". Пад такой назвай Польшча запрапанавала праект, мэтай якога з'яўляецца г.зв. узмацнянне ўсходняга маштабу замежнай палітыкі Еўрасаюза ў адносінах да суседзяў: Украіны, Малдовы, Грузіі, Азербайджана і Арменіі ды — як гэта афіцыйна называецца — на тэхнічным і эксперцкім узроўні — да Беларусі. Да адпаведных прадпасылак таго праекта пераканаў еўрасаюзныя краіны міністр замежных спраў Радаслаў Сікорскі пры падтрымцы свайго шведскага калегі. Усходняе партнёрства (паралельна з французскай прапановай Саюза для Міжмора, значыць, краін паўднёвай Еўропы) мае быць прыярытэтам польскага старшынявання Еўрасаюзу ў 2011 г.*

*— У Польшчы адрозніваем паўднёвых і ўсходніх суседзяў ЕС. На поўдні маем суседзяў Еўропы, на ўсходзе маем еўрапейскіх суседзяў Еўрасаюза, якія, калі выканаюць крытэрыі, аднойчы змогуць старацца стаць членамі ЕС, — гаварыў нядаўна міністр Сікорскі ў Брусэлі.*

*Паколькі ў праекце Усходняга партнёрства ўспомнілі таксама і Беларусь, задумаўся я, што гэта можа абазначаць для гэтае краіны, да якой — як дагэтуль — ЕС падыходзіла з насцярогай, па прычыне паслядоўнасцей рэжыму, які там пануе. Спытаўся я ў адной з асоб — як гэта звыклася казаць у жуналісцкім жаргоне — набліжаных да МЗС у Варшаве. Вось што я неафіцыйна пачуў:*

*— Польская ініцыятыва з'яўляецца ініцыятывай палітычнай, а не дзяржаўна-юрыдычнай. Намерваемся звярнуць увагу на пяць краін актыўных у Еўрапейскай палітыцы суседства (ЕПС), якія маюць (меншыя ці большыя) аспірацыі да членства або набліжэння да ЕС. Гэтае „звяртанне ўвагі" асноўваецца на большых сродках на працэс трансфармацыі і дастасоўвання іх законаў і ўстаноў да нормаў і прынцыпаў ЕС. Іхняе членства залежыць ад саміх зацікаўленых і ўзроўню поспеху рэформ. Беларусь не з'яўляецца фармальна ў ЕПС, таму да яе не можа быць накіравана наша ініцыятыва. Хіба што... улады ў Мінску гэтага захочуць Але для таго ёсць шлях праз размовы з Брусэлем і выкананне дванаццаці ўмоў (дагавор аб свабодным гандлі, бязвізавы рух і г.д.).*

*Мой інфарматар таксама дадаў:*

*— З польскага боку, быццам апярэджваючы рашэнні ўлад Мінска, хочам надзяліць Беларусь эксперцкай ды тэхнічнай дапамогай, якая заключаецца на „ўцягванні" іх у дыялог з ЕС, шляхам невялікіх праектаў накіраваных на стварэнне інфраструктуры дыялогу (трансгранічнае супрацоўніцтва, абучэнні чыноўнікаў і г.п.).*

*З Беларуссю ў кантэксце польска-шведскай прапановы наконт Беларусі ўсё — на маю думку — залежыць ад таго, ці якраз улады гэтай краіны захочуць. З сігналаў, якія да мяне дайшлі — неабавязкова. Хадайнікам Усходняга партнёрства з'яўляецца Аляксандр Мілінкевіч, лідэр беларускай апазіцыі:*

*— Гэта вельмі важная ініцыятыва. У ЕС шмат розных праблемаў, але для нас вельмі важнае, каб справы Усходняй і Цэнтральнай Еўропы засталіся ў дыяпазоне Еўрасаюза. Беларусі вельмі патрэбныя палітычныя і гаспадарчыя кантакты з ЕС, якія, як маю надзею, будзе можна развіваць. Я супраць ізалявання Беларусі.*

*Я думаю, што праект Усходняе партнёрства гэта ідэя да рэалізацыі на гады, асабліва ў выпадку Беларусі і таго ўступнага „тэхнічнага і эксперцкага" аспекта. На гэтым узроўні праект шырэй адкрывае дарогу да кантактаў і супрацоўніцтва. Пакуль. Пачакаю, аднак, каторы з еўрасаюзных экспертаў едучых у Беларусь у рамках папярэдняй рэалізацыі Усходняга партнёрства будзе вернуты з мяжы беларускімі службамі як persona non grata.*

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

# Царкоўным спевам аб’яднацца з Богам

**Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА**

Сёлетні Міжнародны фестываль „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі”, які з 25 па 31 мая праходзіў у Свята-Троіцкім саборы, вылучыўся ўдзелам у ім вялікай колькасці выканаўцаў (каля сарака хароў з дзевяці краін). Прыехала ў Гайнаўку многа прыхадскіх хароў з розных краін Еўропы, якія духовасць спеву прэзентавалі на высокім мастацкім узроўні. Ад свецкіх хароў, у якіх спяваюць прадстаўнікі розных нацыянальнасцей, веравызнанняў, культур, патрабавалася захоўваць каноны царкоўнага спеву.


Пераможны Хор Мікалаеўскага праваслаўнага прыхода з Белавежы

Інаўгурацыя фестывалю пачалася з малебна, які ўзначаліў мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава ў саслужэнні епіскапаў Супрасльскага Грыгорыя і Сямятыцкага Георгія ды многіх святароў. У час гала-канцэрта прысутнічаў архіепіскап Гайнаўскі Міран, а сярод гасцей на абодвух урачыстых сустрэчах былі многія спонсары, некаторыя парламентарыі, прадстаўнікі самаўрадаў і кіраўнікі розных установ. На адкрыцці фестывалю выступілі мінулагодня лаўрэаты — Хор студэнтаў Дзяржаўнай калегіі мастацтва з Гомеля на Беларусі (гранпры) і харысты Політэхнічнага інстытута з Варшавы (першае месца).

— Штогод, перапоўненыя асаблівай радасцю, збіраемся мы ў Гайнаўцы, каб царкоўным спевам аб’яднацца з Богам, — сказаў мітрапаліт Сава ў час адкрыцця фестывалю. — Наш фестываль разгортвае сваю дзейнасць, а мы ў гэтым упэўнены, бо з намі Бог і мы яму давяраем. Сведчыць аб гэтым жывучасць у Гайнаўцы фестывалю „Дні царкоўнай музыкі”. Незалежна ад таго, як яго называем, амаль трыццаць гадоў на фестываль спяшаюцца не толькі хары з нашай краіны, але і з замежжа. Не прыцягваюць іх сюды прэстыжныя ўзнагароды, хары не разлічваюць на мастацкую прамоцыю, бо мастацкі свет не заўсёды заўважае значэнне гэтых дзён, што праходзяць у саборы. Затое хары, якія прымаюць удзел у фестывалі, адклікаюцца на кліч сэрца чалавека веры. Царкоўны спеў — неад’емны атрыбут Царквы, які сведчыць аб яе сіле. Толькі ў храме царкоўны спеў набірае вартасці. Гэтыя атрыбуты з самага пачатку вялі духавенства Свята-Троіцкага сабора да арганізавання гайнаўскіх сустрэч з царкоўным спевам. Давайце зробім усё, каб гайнаўскае царкоўнае спяванне адбывалася ў тым самым стылі штогод, захоўвала свой духовы і адначасна мастацкі характар.


Другое месца заняў хор „Bel canto” Вышэйшай школы інфарматыкі і эканоміі з Ольштына пад кірункам выпускніка Бельскага белліцэя Яна Палавянюка

### Духовасць і мастацтва

Публіка захаплялася высокім мастацкім узроўнем прэзентаванай музыкі, але звяртала таксама ўвагу на яе духовасць, без якой царкоўны спеў перастае быць малітвай. Асаблівай духовасцю вылучаліся выступленні шматлікіх прыхадскіх хароў, якія пастаянна спяваюць на багаслужбах у сваіх цэрквах. Харысты, так як і іншыя вернікі, ідуць у царкву з просьбамі да Бога ў розных жыццёвых выпрабаваннях і стараюцца гэта выказаць у час малітоўнага спеву. Першымі на фестывалі выступілі харысты ў катэгорыі вясковых прыхадскіх хароў і здабылі прызнанне публікі не толькі за прыгожы спеў, але і за яго пакорлівае, малітоўнае выкананне.

— Удзел у фестывалі гэта для нас вылучэнне, — сказалі дырыжор Дзіцяча-маладзёжнага хора Міхайлаўскага прыхода ў Орлі Дзмітры Мартыновіч і айцец дыякан Аляксандр Аляксяюк, які кіруе хорам Мікалаеўскага прыхода ў Міхалове. Абодва дырыжоры адзначылі, што многаму можна навучыцца ад іншых выканаўцаў, ад больш прафесійных хароў. Анна Пост і Паўліна Шэрэнос з арлянскага хора зацікаўленне спяваннем у царкоўным хоры вынеслі з сям’і і самым важным для іх з’яўляецца малітоўны характар спеву. Айцец Валеры Пятроўскі, які вядзе хор у Белавежы, падабраў на фестываль самых лепшых харыстаў.

— Штодзень спяваюць у нас і дзеткі, і старэйшыя асобы, але на фестываль прыехалі тыя, што спяваюць найлепш, — кажа айцец Валеры Пятроўскі. — Аднак былі і складанасці, бо абапіраемся ў галоўным на моладзь, а частка маладых людзей параз’язджалася па Польшчы і таму харыстам цяжка было рыхтавацца да фестывалю.

Больш мастацтва было ў выкананні гарадскіх прыхадскіх хароў.

— Царкоўны спеў з’яўляецца для нас малітвай, без якой цяжка нам абысціся, бо ў нашым прыхадскім хоры мы спяваем з дзяцінства. Калі мы спяваем у храме, глыбей перажываем малітвы, — гавораць Ніка Якімюк і Наталля Рыгаровіч з хора Свята-Троіцкага сабора ў Гайнаўцы.

### Удала выступілі хары з Беласточчыны

Парафіяльныя і свецкія хары з Беласточчыны, у якіх выступала многа беларусаў, рыхтаваліся да фестывалю здаўна і прыехалі, так як і замежныя выканаўцы, за перамогай. Гэтую задачу ў ста працэнтах выканалі харысты Мікалаеўскага праваслаўнага прыхода з Белавежы, якія занялі першае месца ў катэгорыі прыхадскіх вясковых выканаўцаў і Хор Ваяводскай камендатуры паліцыі з Беластока, які перамог у катэгорыі іншых хароў. На другім месцы сярод гарадскіх прыхадскіх выканаўцаў апынуўся Дзіцячы хор Успенскага прыхода з Бельска-Падляшскага. На трэціх месцах у розных катэгорыях было ўжо больш выканаўцаў з Беласточчыны. Яны змагаліся з харамі з усходу і захаду Еўропы і былі вышэй ацэнены конкурснай камісіяй ад часткі замежных выканаўцаў. Апошнімі гадамі гайнаўская публіка звыклася, што сярод прафесійных хароў галоўную ўзнагароду гран-пры атрымлівалі выканаўцы з Рэспублікі Беларусь.


Гала-канцэрт закрыў пераможца ў катэгорыі акадэмічных выканаўцаў Хор дырыжорскага аддзялення Педагагічнага універсітэта з Кіева

Тады яны спявалі на заканчэнне міжнароднага фестывалю ў Гайнаўцы і распачыналі яго праз год. Сёлета гэты прынцып рэалізаваўся толькі часткова. Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі адкрываліся з удзелам мінулагодняга лаўрэата ўзнагароды гранпры — хора з Гомеля. Аднак цяпер конкурсная камісія ў катэгорыі прафесійных хароў не прызначыла ні ўзнагароды гран-пры, ні першага месца. У такім выпадку мерапрыемства царкоўнай музыкі закрыў Хор дырыжорскага аддзялення Педагагічнага універсітэта з Кіева, які заняў першае месца сярод акадэмічных хароў.

Перадапошнім выканаўцам на гала-канцэрце быў хор „Bel canto” Вышэйшай школы інфарматыкі і эканоміі з Ольштына, які заняў другое месца. Кіруе ім выпускнік Бельскага белліцэя Ян Палавянюк, але спяваюць у ім таксама іншыя выхадцы з Беласточчыны. Адзіным хорам з Рэспублікі Беларусь на фестывалі быў невялікі Мужчынскі камерны хор праваслаўнага прыхода Усіх Святых з Мінска, які арганізатары ўключылі ў лік прафесійных выканаўцаў. Як на парафіяльны гарадскі хор, у якім спяваюць маладыя хлопцы з вышэйшай музычнай адукацыяй, выступіў ён вельмі ўдала, але сярод прафесійных хароў атрымаў толькі вылучэнне.

У час конкурсных слуханняў, адкрыцця і закрыцця фестывалю ў саборы збіраліся не толькі вернікі з Гайнаўшчыны, але і жыхары розных раёнаў Польшчы.

— Наш фестываль прыцягвае ў Гайнаўку шматлікіх аматараў царкоўнай музыкі, становіцца месцам сустрэч, абмену вопытам, пачаткам сяброўства і супрацоўніцтва. Фестываль становіцца гайнаўскім святам песні і адначасна музычным фестывалем Падляшша, — сказаў яго дырэктар, мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч. Арганізатары фестывалю, якімі з’яўляюцца Грамадскі арганізацыйны камітэт і Аб’яднанне „Любіцелі царкоўнай музыкі” наладзілі таксама канцэрты ў Варшаве і розных мясцовасцях Падляшша, а асобны пленэрны канцэрт адбудзецца ў Асяродку лясной адукацыі „Ягелонскае” каля Белавежы. Па-за храмамі ўдзельнікі фестывалю побач царкоўнай музыкі прэзентавалі таксама свецкія творы, абапертыя часта на нацыянальных традыцыях.

### Іншыя пераможцы

Другое месца сярод вясковых прыхадскіх хароў занялі харысты са Старакаталіцкага касцёла Марыявітаў з Добрай (каля Лодзі), а трэцяе — хор Праваслаўнага прыхода Божай Маці „Мілуючай” з Чаромхі.

У катэгорыі гарадскіх прыхадскіх выканаўцаў перамог хор „Праабражэнне” Сабора св. Аляксандра Неўскага з Мелітопаля (Украіна), другое месца побач дзетак з Бельска занялі харысты Уваскрасенскага праваслаўнага прыхода з Падгарыцы (Чарнагорыя), а на трэцім месцы апынуліся дзеткі і моладзь з Прыхода Нараджэння св. Іаана Хрысціцеля з Гайнаўкі і харысты з Георгіеўскага прыхода з Беластока.

Сярод акадэмічных хароў, апрача ўжо ўспамянутых, другое месца заняў Жаночы хор Музычнага аддзялення Маскоўскага педагагічнага універсітэта, а трэцяе — хор „Поліфанія”, у якім спяваюць працаўнікі і студэнты Беластоцкага політэхнічнага інстытута.

У катэгорыі прафесійных хароў другое месца заняў Маскоўскі армянскі камерны хор (не было таксама і трэцяга месца).

У катэгорыі іншых хароў на другім месцы апынуўся хор Праваслаўнай духоўнай акадэміі і Духоўнай семінарыі з Санкт-Пецярбурга, а трэція месцы занялі хор „Іверская свечка” з г. Тэльшай (Літва) і Украінскі мужчынскі хор „Жураўлі” з Варшавы.

## Медалі шлюбным парам

Гмінныя самаўрады штогод пасылаюць у канцылярыю Прэзідэнта РП заявы з прапановамі прысвоіць сеніёрам медалі з нагоды пяцідзесяцігоддзя шлюбнага жыцця. Сёлета ў Чаромхаўскай гміне прымеркаваная да гэтага юбілею імпрэза адбылася 1 лютага. Юбілейныя медалі атрымалі: Яўгенія і Міхал Бандарукі, Леакадзія і Антон Хрусьвіцкія, Софія і Юзэф Міхальскія, Юзэфа і Казімір Стэрнічукі, Вольга і Рыгор Верамюкі, Марыя і Мікалай Зінчукі з Чаромхі-Станцыі, Надзея і Мікалай Ляшчынскія, Лідзія і Яўген Шатыловічы з вёскі Чаромха, Ніна і Сяргей Рошчанкі са Ставішчаў, Марыя і Ян Данілюкі, Клаўдзія і Сяргей Саўчукі з Кузавы. У мерапрыемстве ўдзельнічала дэлегацыя Ваяводскай управы, якую ўзначаліў Анджэй Уладзіслаў Гаўкоўскі — дырэктар Аддзялення грамадзянскіх спраў і іншаземцаў. Войт гміны Міхал Врублеўскі і кіраўнік ЗАГСа Аліцыя Пытэль ад імя Прэзідэнта Рэчы Паспалітай уручылі юбілярам медалі, а ад Гміннай управы — падарункі і кветкі, а ганаровыя граматы ад падляшскага ваяводы ўручыў дырэктар Гаўкоўскі. Мерапрыемства праходзіла пры сціплым пачастунку і ў сяброўскай атмасферы. Варта адзначыць, што Чаромхаўская гміна паслала ў Варшаву чарговыя заявы і трэба спадзявацца, што яшчэ ў гэтым годзе пятнаццаці сужонствам з нагоды 50-гадовага юбілею будуць прысвоены медалі.

**(ус)**

Нараўчанская гміна

## На нашых дарогах

Вельмі добра, калі ў пару задбаць пра гравейкі! Так робяць у Нараўчанскай гміне. 14 мая г.г. ехаў я дарогай без асфальту з Гарадзіска каля Нараўкі ў вёску Плянта. Тут ухабіны падсыпалі пяском і пусцілі грэйдэр. Раўнялі дарогу з Падляўкова ў Крыніцу цераз Барнацкі Мост. Зараз прыемна па такой ехаць!

Неўзабаве будуць раўняць гравейку ад скрыжавання ляшуцкай дарогі з ваяводскай з Навасадаў у Юшкаў Груд цераз Бандары. На ёй нядаўна паставілі ўсе неабходня дарожныя знакі і высеклі дрэвы на скрыжаваннях ды на крутых паваротах.

**(ян)**

## Калі заплаціць?

Атрымаў я 7 красавіка 2008 года ад Паслугова-гандлёвага гарадскога прадпрыемства ачышчання ў Беластоку фактуру за вываз смецця з майго панадворка. Фактура надрукавана 21 сакавіка 2008 г., тэрмін аплаты — 31 сакавіка 2008 г. Паколькі я атрымаў ліст з фактурай тыдзень пазней, мушу плаціць адсоткі таму, што плачу пасля вызначанага чысла. Стаўлю пытанне: ці я, заплаціўшы кару, магу парваць дагавор з імі на адбор смецця з майго панадворка?

**Мікалай ЛУК'ЯНЮК**

# У пошуках спакою і грошай

**Аляксандр ВЯРБІЦКІ**

У рамках Фестывалю культуры і навукі, які ладзіўся культурнымі і навуковымі ўстановамі Падляшскага ваяводства ў апошніх днях мая г.г., беластоцкая Вышэйшая менеджэрская школа запрапанавала даклад на тэму добраўпарадкавання пустуючых вясковых будынкаў. Такіх будынкаў у нашых вёсках зараз шмат, бо апусцелі яны так у выніку міграцыі вясковай моладзі ў гарады, як і ў выніку змены ўмоў земляробчага гаспадарання. Па вёсках Беласточчыны асталіся не толькі пустыя хаты, якія найбольш відавочныя, бо ставіліся найбліжэй вуліц, але ў глыбіні панадворкаў пустуюць хлявы, клуні, свірны. Бывае, што побач пакінутых старых хлявоў ці абораў узводзяцца новыя жывёлаводчыя комплексы, якія задавальняюць патрабаванні сучаснай вялікатаварнай гаспадаркі. Чаму ж бы не прыглянуцца гэтай тэме, не паратаваць тых сірацеючых будаўнічых вырабаў колішняга мясцовага насельніцтва, не пашукаць ім новага абшару прымянення?

Даклад на вышэйзгаданую тэму зачытаў д-р Антоні Роман, навуковы працаўнік Вышэйшай менеджэрскай школы. І не былі гэта нейкія тэарэтычныя разважанні, толькі расказ пра яго ўласныя практычныя дасведчанні ў гэтай галіне. Спадар Роман будуе, менавіта, свой уласны экатурыстычны комплекс, скарыстоўваючы для яго старыя будынкі, купленыя ў розных мясцовасцях нашага ваяводства. Сваю гаспадарку ўзводзіць ён у вёсцы Акопы, што ў трох кіламетрах ад Сухаволі. У Сухаволі ён купіў стары дом, пабудаваны аж у 1850 годзе. Купіў ён там таксама абору і стадолу, а тры свірны прывёз аж з-пад Калакаў-Касцельных, што ў Высокамазавецкім павеце. І ўсе гэтыя старыя будынкі спадар Роман бачыць не ў той мізэрнай сельскагаспадарчай, мужыцкай ролі, якую яны выконвалі дагэтуль, але хоча іх набілітаваць у новае архітэктурнае саслоўе. Усе гэтыя будынкі маюць калектыўна выконваць ролю гасцініцы.

Чаму ж такая гасцініца ў вёсцы? Бо сам гаспадар гэтай навінкі сцвярджае, што вёска заўсёды прыцягвае. Тут цішыня, зелень, бяспечнасць — цяпер між суседзямі нават платоў няма. І менавіта на вёсцы будзе магчымасць паказаць як людзі калісь жылі, чым займаліся, якія тут праводзілі абрады, якія былі звычаі, традыцыі. Тут побач сябе элементы язычніцкай і хрысціянскай культуры; курганы і старыя крыжы. І народ тут веруючы, прыхільны. Праўда, гэтую прыхільнасць новы чалавек у вёсцы атрымаў не адразу, трэба было спачатку здабыць давер у мясцовага насельніцтва, і цяпер ужо, калі нават новы гаспадар адсутнічае і паўгода, нішто з ягонай маёмасці не прападае.

Якія ж свае мроі праводзіць у жыццё спадар Роман? Будынкі паставіў ён на каменных падмурках, а камяні тыя ён сам асабіста звозіў тачкай з навакольных палёў; такім чынам ён раз'ездзіў ужо тры тачкі. Камяні тут не толькі выконваюць ролю падмуркаў, яны таксама служаць аздабленню і ўжытковаму аснашчэнню панадворка, напрыклад, з камянёў пабудавана там міні-сталовая пад адкрытым небам (стол і сядзенні), з камянёў таксама вяндлярня. Гаспадар пабудаваў таксама экалагічную хатнюю ачышчальню. Выкапаў стаў, над якім на палях хоча ўзвесці кухню. У планах і сауна. А за рачулкай-бурчаком мае паўстаць гай з месцам для трапезы...

Праўда, новы комплекс можа крыху не ладзіцца з традыцыйным будаўніцтвам Акопаў. Бо галоўны аб'ект, колішняя сухавольская хата, якой звыш ста пяцідзесяці гадоў, атрымала надта нетрадыцыйны бляшаны дах ды сучасныя аднастворкавыя вокны. Кухня на вадзе гэта таксама свайго роду палацавая экстравагантнасць. Гэтыя тонкасці, аднак, па-мойму, не будуць калоць у вочы задуманых у мроях наведвальнікаў. Спадар Роман, як мне здаецца, разлічвае прымаць у сябе паломнікаў; у час дакладу ён абмовіўся, што візіт у Акопах з'яўляецца адной з умоў атрымання турыстычнай адзнакі імя ксяндза-мучаніка Ежы Папялушкі, які родам менавіта з Акопаў. А статыстычнаму паломніку, якому ежу будуць рыхтаваць у наводнай кухні, будзе, як мне здаецца, „всё хорошо".

Час пакажа, ці спадар Роман пацэліць у дзесятку са сваім турыстычным праектам. Але гэта адна з магчымасцей, адзін з варыянтаў разгортвання турыстычнага бізнесу. У Акопах такія спадзяванні, у іншых мясцовасцях напэўна таксама знойдуцца аб'екты, вартыя ўвагі будучых турыстаў. А людзі з гарадоў, дзе ўсё трэба і працаваць, і жыць амаль галопам, будуць шукаць нейкай перадышкі. На модных курортах ці іншых „бязлюдных" выспах робіцца мітуслíва, людна, не ўсім такая гамана прыйдзецца па душы. Трэба спадзявацца розгляду за спакоем менавіта па аддаленых ад гарадоў вёсках, у тым антуражы, які паўстаў у няспешнай мінуўшчыне.

# Выстаўка „Агія Сафія..." у Супраслі

**Тэкст і фота Віктара ШВЕДА**

„Агія Сафія ў Канстанцінопалі — як крыніца тэалогіі, архітэктуры і іконы ў праваслаўі — гісторыя і сучаснасць" — пад такім загалоўкам экспанавалася ў Беластоку выстаўка, якая ўзнікла па інспірацыі Хрысціянскага экуменічнага аб'яднання „Oikoumene" ў РП. Члены аб'яднання шмат папрацавалі пры падрыхтоўцы экспазіцыі.

Камісарам выстаўкі і адначасова аўтарам каля 350 дасканалых каляровых здымкаў з'яўляецца архітэктар, доктар Ежы Усціновіч з Політэхнічнага інстытута ў Беластоку. Здымкі датычаць не толькі Агіі Сафіі, але таксама Агніі Ірэнэ, Хора, цэркваў Кападокіі, Кіева, Ноўгарада, Полацка і Гродна.



*Аляксандра Шавела-Навацкая на фоне выстаўкі*

Кшыштаф Гадлеўскі, уласнік прадпрыемства „Luca" ў Беластоку падрыхтаваў 100 таблiц для размяшчэння здымкаў.

Зразумела, што немагчымай была б экспазіцыя без спонсара, якім быў Васіль Піўнік.

У тэрміне ад 12 лютага да канца сакавіка 2008 года выстаўка экспанавалася ў зале Цэнтра праваслаўнай культуры ў Беластоку. Пазнаёміліся з ёю шмат наведвальнікаў. Многія з іх сваё захапленне і шчырую падзяку за надзвычай цікавую экспазіцыю ўпісалі ў памятную кніжку.

Ад 3 красавіка да 7 мая гг. выстаўка экспанавалася ў зале Універсітэцкай бібліятэкі імя Ежы Гедройца ў Беластоку, а ганаровы патранат трымаў рэктар Універсітэта праф. Ежы Нікітаровіч. І тут было таксама многа наведвальнікаў і пахвал у памятнай кніжцы.

Кшыштаф Гадлеўскі з сынам Лукашом перавезлі бясплатна сваім транспартам выстаўку ў Супрасльскі манастыр. Кіраўніцтва Хрысціянскага экуменічнага аб'яднання „Oikumene", у пагадненні са спонсарам Васілём Піўнікам, вырашылі прынесці ў падарунку выстаўку Супрасльскай акадэміі. Канцлер Акаламіі айцец Уладзімір Місіюк, прымаючы выстаўку сцвердзіў, што будзе яна пастаяннай экспазіцыяй у Акадэміі, захоўваючы сваю назву з наступным зместам:

„Выстаўка ўзнікла з інспірацыі Хрысціянскага экуменічнаша аб'яднання „Oikoumene" ў РП, з благаславенства патрыярха Канстанцінопаля Варфаламея І. Фундатарам выстаўкі з'яўляецца Васіль Піўнік, уласнік ганаровага звання архонта і дэпутата горада Канстанцінопаля. Аўтар здымкаў доктар архітэктар Ежы Усціновіч з Політэхнічнана інстытута ў Беластоку".

Пагадненне падпісалі а. Уладзімір Місіюк (канцлер Акадэміі), Аляксандра Навацкая і Галіна Грык (старшыня і намеснік Аб'яднання).

# Беларусь у кантэкстах

Ілона КАРПЮК

**Ад некалькіх гадоў Польшча з'яўляецца краінай, адной з нямногіх у Еўропе, моладзь якой на розныя спосабы цікавіцца Беларуссю. Самым важным момантам быў выбарчы перыяд 2006 года, які парушыў перш за ўсё прыхільнікаў дэмакратычных змен ва ўсходняй суседняй краіне. На чале ўсіх дэманстрацый, пікетаў, акцый стаялі маладыя людзі, дзякуючы ангажаванасці якіх у працу розных арганізацый аказалася, што голас можна падаваць не толькі на вуліцы. Пачаліся канферэнцыі, г.зв. беларускія дні, канцэрты. Усё пачало набіраць тэмпаў. Зараз маем 2008 год. Колькасць актыўных на ніве беларускіх спраў людзей, мабыць, у агульнай статыстыцы не павысілася, затое даспявае погляд на вартасць чарговых падзей. Так як і беларускія студэнты ідуць у бок навуковага падыходу да спраў сваёй нацыі, так і студэнты ва ўсёй Польшчы пачынаюць цікавіцца і заадно знаёміць сваіх сяброў з беларускімі тэмамі. Прыкладам гэтаму былі два дні (29-30 траўня г.г.) з беларускай культурай у Торуні, у рамках якіх адбылася і навуковая канферэнцыя.**

„Беларусь і яе сучасныя гістарычна-культурныя кантэксты" — гэта асноўная тэма канферэнцыі, ладжаная студэнтамі Інстытута міжнародных адносін Універсітэта Мікалая Каперніка ў Торуні. Загаловак невыпадковы.

— Хочам ісці насуперак усім, — сказала Аня Лушынская, сааўтарка ідэі канферэнцыі. — Нам надаелі ўжо канцэрты і сустрэчы, на якіх гаворыцца пра Беларусь толькі як пра лукашэнкаўскую дзяржаву і таму хочам маладым людзям паказваць іншыя аспекты Беларусі ды беларускай культуры.

Аня ў сваім беларускім, сяброўскім асяроддзі вядомая як вялікі фанат беларускай музыкі і гурту „Н.Р.М.". Аказваецца, што навука ў вышэйшай вучэльні разбудзіла ў яе патрэбу шукаць чагосьці больш чым толькі простую канфігурацыю слоў з музыкай. Пачала яна рэалізаваць свае намеры з дэканструкцыі свету, прадстаўленага ў праекце „Народны альбом". Гэта адна з тэм, прадстаўленых ёю ў час канферэнцыі, бо варта дадаць, што Аня не толькі арганізатар, але і лектар. Аказваецца, што не толькі ўнутраная цікавасць адыграла значную ролю ў распаўсюджванні беларускіх тэм у торуньскім універсітэце. Заслужаная на гэтай ніве доктар Дарота Міхалюк, апякун Навуковага гуртка славянскіх студыяў. Зусім нядаўна прымала яна ўдзел у канферэнцыі, прысвечанай дзейнасці Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў міжваенны перыяд, а зараз прадставіла свой погляд на беларускую гістарыяграфію ды народную міфалогію. Аднак асноўнай тэмай у яе навуковай працы з'яўляецца праблема ўзнікнення Беларускай Народнай Рэспублікі. Немагчыма, каб не паўплывала гэта на яе студэнтаў!

Старшыня Гуртка славянскіх студыяў Патрык Ваўжынскі, хаця яшчэ нядаўна аддаваў перавагу сербскай мове, зараз у рамках этналогіі і міжнародных адносін задае сабе і іншым пытанне чаму І сусветная



Выступае В. Альшэўскі

вайна не прынесла Беларусі незалежнасці. А ісці яму ў гэты бок, зразумела, падказала доктар Міхалюк. Арганізатар канферэнцыі Тамаш Блашчак піша ўжо доктарскую дысертацыю. І яе тэма здаецца быць невыпадковай. Займаецца ён беларусамі на тэрыторыі Літвы ў міжваенны перыяд. А ён не апошні, які цікавіцца дваццатымі гадамі мінулага стагоддзя. Але гісторыя гэта толькі адзін з кантэкстаў....

Важнымі галінамі беларускай культуры з'яўляюцца архітэктура



Т. Блашчак і Д. Міхалюк

і мастацтва. Марта Шаўкевіч, студэнтка з Кракава, перанесла нас у гродзенскую кафедру і на яе прыкладзе звярнула ўвагу на ўплыў сусветных накірункаў у арнаментыцы. Аканты ды іншыя матывы прыцягваюць увагу зацікаўленых гісторыяй мастацтва не ад сёння, таму і нам варта ведаць чым багатая гісторыя беларускага мастацтва. Надзея Вярбоўская з універсітэта ў Гданьску таксама цікавіцца беларускай архітэктурай, але ўпісвае яе ў кантэкст старых расказаў, легенд, звязаных з гісторыяй старых замкаў і палацаў, неаднакратна тых, з якіх асталася толькі апошняя цаглінка. Уступ да гэтага аналізу размалявала яна слайдамі з вывамі, між іншым, навагрудскага замка, палацаў у Нясвіжы, Ружанах...

— У гэтым палацы інтэндантам быў мой прадзед, — прашаптала доктар Міхалюк, гледзячы на ружанскі палац.

Усё нібыта зачыняецца ў адным коле зацікаўлення беларускай гісторыяй і культурай.

На літаратурнай ніве ўвесь час актуальная тэма першага перакладу „Winnie The Pooh" Алана Аляксандра Мілна. Беларускі „Віня-Пых" яшчэ змагаецца з рознымі кантраверзамі, як хаця б яго беларускае званне, але аўтар перакладу Віталь Воранаў заўсёды там, дзе яшчэ можна і варта, тлумачыць чаму так і чаму ўвогуле ўзяў на сябе цяжкасці беларускага перакладу. Літаратура, мастацтва ды кіно паяўляліся як кантэксты ўсюды там, дзе прынамсі ў пару словах гаварылася пра беларускую культуру. Вельмі цікава да тэмы беларускай кінематаграфіі падышоў Адам Трывога. Параўнаў ён вобразы вайны і партызан на беларускіх землях у фільмах, створаных яшчэ ў Савецкім Саюзе (для прыкладу „Ідзі і глядзі" Клінава, карціна якога спасылаецца на прадказанні евангелічнага апакаліпсісу), з фільмамі, якія зараз ствараюцца беларусамі (добрым прыкладам з'яўляецца „Містэрыя акупацыя" Кудзіненкі).

— Усё пачалося з Таркоўскага, — сказаў Адам Трывога. — Ён быў для мяне інспірацыяй, з якой я пачаўся цікавіцца кіно. У сваіх аналізах правандраваў я проста з Расіі ў Беларусь.

Канферэнцыя мае свае правы, таму і паяўляліся менш выяўленчыя тэмы, напрыклад, палітыка Еўрасаюза ў карысць фарміравання дэмакратычнага грамадства ў Беларусі ці сацыялагічныя доследы сярод маладых беларусаў, якія, паводле Паўла Юшкевіча, цэлы час знаходзяцца на скрыжаванні жыццёвых дарог, адкуль цяжка пайсці ў адным канкрэтным напрамку.

Удзельнікі канферэнцыі пачулі таксама голас вольнай Беларусі, аб'яднаны Ініцыятывай Вольная Беларусь, якая ладзіць у Польшчы самыя вялікія канцэрты салідарнасці з Беларуссю.

Хаця не ў кожным моманце погляд і аналіз меў навуковую форму, то ў навуковасці канферэнцыі адмовіць нельга. Студэнты прымаюць розныя формы зацікаўлення беларускімі тэмамі, але галоўнае, што яны шырэйшыя за фармулёўкі „беларусам патрэбная дапамога" ці „беларуская музыка вельмі файная". Віншую арганізатараў, хаця хацелася б у будучыні, каб такія галасы пачула намнога больш чалавек, чым толькі ўдзельнікі канферэнцыі. Высновы? Трэба проста шукаць цікавых, новых форм размовы пра Беларусь і беларусаў, а навуковы бок гэта напэўна адзін са спосабаў.

## Яшчэ раз аб „Ніве"

Прачытаўя артыкулы Мікіты Драздa („Ніва" № 11) ды Уладзіміра Сідарука („Ніва" № 15) — іхнія роздумы пра наш тыднёвік і таксама, як шматгадовы карэспандэнт ад пачатку яго існавання, задумаўся. Калісь, бывала, „Ніва" арганізавала кожны год для пісьманосцаў конкурс — за змаганне ў падпісцы на „Ніву" сярод чытачоў. Часта выйгрываў яго Мікалай Панфілюк — лістаноша з Дубіч-Царкоўных і адначасова наш карэспандэнт. Бывала, распаўсюджваў ён па 200 экземпляраў „Нівы" ў месяц! На пошце ў Трасцянцы працаваў Уладзімір Андраюк, і ён у кожную пятніцу даносіў „Нівы" па каля 100 экземпляраў. Настаўнікі, якія вялі ўрокі беларускаай мовы ў пачатковых школах, выпісвалі „Ніву" і ўсе дзеткі, што вывучалі родную мову, падпісваліся на яе. Цяпер на пошце на раён Трасцянкі, што ў Нарваўскай гміне, толькі я адзін з'яўляюся пастаянным падпісчыкам „Нівы", ды і Галена Тапалянская, якая пастаянна купляе „Ніву" ў пісьманосца. А куды падзеліся іншыя чытачы беларускага тыднёвіка — цяжка адказаць на гэта. Падпісваюцца вучні ў зборнай школе ў Нарве — тыя, хто вывучае родную мову. Чаму ж гэта такія нячулыя на нашы справы сталі нашы, праваслаўныя беларусы? Ці мо саромяцца сваёй мовы? Мала гэтым цікавяцца, мабыць, і беларускія дзеячы, а ёсць нават і такія, што „Ніве" ахвотны пашкодзіць — аж сорамна пра такое падумаць! На маю думку, усе лідэры беларускіх суполак павінны разам падумаць як павялічыць лік людзей, якія чытаюць наш адзіны беларускі тыднёвік.

На маю думку, не варта друкаваць столькі артыкулаў пра беларускі спорт, лішні гараскоп, і трэба менш займацца палітыкай, асабліва суседняй дзяржавы.

Сапраўды, „Ніва" прыгажэе з году ў год. Артыкулы сталі намнога цікавейшымі. Толькі трэба дбаць аб большую колькасць карэспандэнтаў маладога пакалення — хай яны зоймуць месца старога авангарда!

**Мікалай ЛУК'ЯНЮК**

Ляўкова

## Людзі і лавачкі

Вёска Новае Ляўкова ў Нараўчанскай гміне бурліла жыццём ужо 80 гадоў таму. Дамы стаялі густа паабапал вуліцы. Каля кожнай хаты, ля драўляных платоў стаялі лавачкі. У святочныя дні ад вясны да позняй восені на лавачках (дошках на слупках) сядзелі сяляне. Было тут дваццаць лавачак. На адных сядзелі мужчыны маладыя і старэйшыя, на іншых — групкі жанчын, часта з малалеткамі на руках. Тэмаў для размоў мелі процьму. У 1928 годзе ў Ляўкова прыехалі на пастаяннае жыхарства людзі м.інш. з Новага Беразова, Ліпін, Гарадзіскa каля Ласінкі. Ляўкоўскі пан прадаваў быў зямлю.

І так сядзелі на лавачках — як сам добра памятаю — зачаплялі праходзячых і праезджых, абмяркоўвалі, як кажуць, да сухой ніткі. У будні дні на лавачках там-сям грэліся на сонейку дзядулі і бабулі.

Зараз лавачкі ў Новым Ляўкове ўжо знікаючы элемент вёскі. Іх усяго чатыры, у тым ліку адна каля апусцелай хаты. І не відаць — нават у Вялікдзень — людзей на лавачках... Ціха, сумна.

**(ян)**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

# Гайнаўскія белліцэісты ў Мінску



Вучні першых і другіх класаў Гайнаўскага белліцэя ў Мінску

Май — самы лепшы месяц на школьныя экскурсіі. Не забылі аб гэтым таксама настаўнікі нашага ліцэя. Яны наладзілі нам цудоўную паездку ў Беларусь. Ахвотных ехаць было шмат. У групе апынуліся вучні першых і другіх класаў. Большасць з іх упершыню мела магчымасць убачыць сталіцу Беларусі.

На працягу трох дзён мы наведвалі помнікі духоўнай і матэрыяльнай культуры Мінска і яго ваколіц. У першы дзень вечарам мы падаліся ў Тэатр імя Янкі Купалы на „Паўлінку”. У антракце была магчымасць захапляцца з верхніх вокнаў тэатра суседнімі пабудовамі, у тым ліку рэзідэнцыяй прэзідэнта Беларусі.

Чарговы дзень прынёс нам незвычайныя ўражанні ад візіту ў Нясвіжы. Вучні мясцовай школы сустрэлі нас хлебам і соллю, паказалі свае здольнасці ў песні і танцах. У горадзе мы ўбачылі шматлікія непаўторныя месцы, м.інш. Радзівілаўскі парк.

Рады шматпавярховых і аднастайных жылых дамоў, вуглаватыя „Ла-ды”, стэрыльная шырасць вуліц — вось тыповая карцінка з акна нашага аўтобуса ў час экскурсіі па горадзе. У мясцовым Макдоналдсе, як навінку, прапанавалі нам біг-макі, у метро павучалі нас словамі „Асцярожна, дзверы зачыняюцца!”. Дзеці ў тэатры былі здзіўлены, калі я загаварыла да іх па-беларуску. Лёгкай рукой мы выдавалі тысячы рублёў на халву і цукеркі, а партаманеты рабіліся штораз больш тоўстымі. Маю ўвагу звярнула падполле нелегальных „штампаварак”, якое, на самай рэчы, не было падполлем — побач арыгінальных дыскаў ляжалі г.зв. „піраты”. Паўсюдныя службы ў мундзірах, паўсюдныя пэйсікі з-заду на галовах у мужчын, паўсюдны хлебны квас.

Чым мацней я напружвала слых, каб пачуць Свабодную Беларусь, тым выразней я чула рускую мову. Чым больш я выглядала бел-чырвона-белых слядоў Свабоднай Беларусі, тым часцей паяўляліся сляды камуністычных, цяжкіх ботаў, якія выходзілі з самага важнага дзяржаўнага будынка. Хаця была гэта школьная экскурсія (дарэчы, вельмі ўдалая), дык ці ж нас, вучняў беларускага ліцэя, павінна цікавіць толькі беларуская халва?

**Анна ПАЎЛОВІЧ**



У першы дзень паглядзелі мы „Паўлінку” ў Тэатры імя Янкі Купалы

# Дзіцячая эстрада



Амаль 20 гадоў прайшло з таго моманту, калі я ўпершыню выступіла ў конкурсе беларускай песні. Была я тады ў трэцім класе пачатковай школы і вельмі хвалявалася. Здаецца мне, што не была я адзетая ў беларускія вышываныя касцюмы, але добра помню песні, якія я выконвала, а менавіта „Родны мой горад” і „Белы снег”. Праўда, на сцэне не было жывых інструментаў, толькі запісанае раней музычнае суправаджэнне акардэона. Сёння гэтыя песні сярод дзяцей ужо нямодныя, а спяваць з акардэонам таксама архаічная з’ява. Дык у якім напрамку ідзе дзіцячая ды маладзёвая эстрада?

Да рэфлексіі схіліў мяне апошні агляд „Беларуская песня-2008” для садкоў, пачатковых школ і гімназій. Форма гэтых аглядаў не мяняецца гадамі, бо конкурс гэта конкурс дык навошта ж яго мяняць. Горш аднак, калі не мяняецца стыль выканання песень, не мяняецца рэпертуар, а на сцэне кожны другі выступ бачым народную вышыўку. Гэта можа і нядрэнна, але дзесьці губляецца дзіцячая радасць, спантаннасць. Трэба пахваліць „Журавінкі” з Бельска-Падляшскага. І ў касцюмах, і ў рэпертуары дзяўчаты паказалі не толькі добрую падрыхтоўку, але дзякуючы ім было відаць, што гэта дзіцячы фестываль, а не копія беларускай эстрады. Для параўнання скажу і пра гайнаўскую „Знічку”. Відаць якаснае выкананне, цяжкую ды эфэктыўную працу, але дзесьці між словамі і гукамі адчувалася манера, якая не падыходзіць узроўню гімназіі. Я таксама праходзіла эстрадную дарогу ў ліцэі і сёння адчуваю, што тады не ставала нам натуральнасці і сапраўдных маладзёвых, у выпадку некаторых дзіцячых, эмоцый. Вядома, што натуральна выступілі дзеці з садкоў. Ім проста цяжка прыняць штучную міну, бо яны найчасцей так былі спалоханыя сцэнай, што ад сімпатыі для іх хацелася смяяцца. Варта звярнуць таксама ўвагу на адважны ў гэтым кантэксце выступ школьнікаў з Ягуштова, якія ўцяклі ад ціску агульных тэндэнцый і выступілі з жывымі інструментамі. Варта перадумаць на будучыню што варта спяваць і чаго проста варты нашы дзеці.

**ІК**

Міра ЛУКША

# Кот Амур з Іванкоў



Кот Амур не ходзіць у ботах,
Нават ціхіх, на работу:
Ціхаступы-тапкі носіць,
Есці ён таму не просіць,
І не ўчуеш, як Амур
Ціха скочыць цераз мур,
Узбярэцца і на плот —
Ён жа самы лоўкі кот
У Рагазах ды Іванках!
На мышэй наводзіць страх!
А папраўдзе, скажам вам,
І не трэба тут рэклам,
Не аматар ён мышэй,
Ён глядзіць на свет вышэй:
У Іванках і Рагазах
Хай і мыш спіць па начах,
Хай утульна тут жыве,
Сваё зернейка жуе...
Хіба што! Тады Амурка
Нат не гляне, нат не муркне,
Так правучыць хуліганку,
Што спакой парушыць зранку!
Тады мышкам будзе страх
У Рагазах ды Іванках!

# Зберагчы рэчы

**Нас, вучняў Гімназіі ў Гарадку, зацікавіла старадаўняя хата на другім паверсе нашай школы. Мы даведаліся, што гэты помнік даўніны прыдбалі нашы настаўнікі. Нам захацелася даведацца больш пра гэты домік, таму мы вырашылі пагутарыць з настаўнікам Аляксандрам КАРПЮКОМ.**

***— Добры дзень! Спадар Аляксандр, адкуль у Вас задума стварыць такую Залу традыцыі?***

— Я хацеў зберагчы старыя рэчы, якія гінуць з нашага жыцця. Замяняе іх пластык. З другога боку быў такі час, калі ў многіх школах ствараліся рэгіянальныя залы і я задумаў нашу сапраўдную хату зрабіць на II паверсе школьнага будынка. Яшчэ адной прычынай было тое, што ў нашай гміне няма ніводнага музея, у якім былі б помнікі даўніны.

***— Адкуль прадметы ў Зале?***

— Экспанаты прыносілі вучні ад сваіх дзядоў, а таксама самі бацькі. Многія людзі, нават не звязаныя са школай, перадавалі нам вартасныя рэчы. Вельмі прыемна было, калі адзін чалавек на адкрыццё Залы (ён нават не быў запрошаны) прынёс вельмі цікавую дошку з прозвішчам лекара, яўрэя, якога ў вайну забілі немцы. Карыстаючыся нагодай я шчыра дзякую ўсім ахвяравальнікам.

***— Наша зацікаўленне выклікаў інтэр'ер хаты? Мы захапіліся яго прыгажосцю. Нам хочацца даведацца больш, у нас проста нарастае цікавасць. Скажыце, калі ласка, хто дапамагаў Вам стварыць хатку?***

— Дапамагала наша дырэктарка Анна Грыцук, якая дазволіла здзейсніць гэтую задуму. Ад пачатку ўключыліся нашы гімназісты, перш за ўсё ўдзельнікі Еўрапейскага клуба, а таксама вучні пачатковай школы. Многа дапамаглі бацькі, настаўнікі і ўсе працаўнікі школы. Вялікая заслуга Аляксандра Боцькі — нашага сантэхніка.

Не было б хаты без дапамогі кіраўніка Камунальнага бюджэтнага прадпрыемства і яго працаўнікоў. Атрымалі мы дапамогу з Надлясніцтва ў Гарадку і многіх іншых установаў і людзей, якім на сэрцы ляжыць супольная справа — памяць аб нашым прошлым.





***— Мы не ведаем да чаго служылі паасобныя прадметы. Раскажыце, калі ласка, пра экспанаты ў хатцы.***

— Куфар — інакш драўляны сундук, у якім трымалі тканыя рэчы. Куфар выконваў ролю сённяшняй шафы, жанчыны трымалі ў ім адзежу, пасцель, ручнікі. З малым сундучком, які тут бачым, у царскія часы салдаты ішлі ў армію. З вялікім сундуком маці выпраўлялі дачок замуж. У пасажны куфар клалі хусты, кашулі, ручнікі, пасцель і прывозілі да мужыка.

***— Тут відаць таксама тару; да чаго яна служыла?***

— Тара заступала цяперашню пральную машыну. Жанчыны грэлі ваду ў саганах (вялікіх гаршках), налівалі ваду ў балею і, найчасцей шэрым мылам (якое самі варылі), паціралі рэчы аб тару. Спачатку тары былі драўляныя, пазней жалезныя. Была гэта цяжкая праца, церлі, шаравалі брудную адзежу, абрусы і вялікую пасцель рукамі. А ў вёсцы, на гаспадарцы, ёсць цяжкая і брудная работа. І каб хвалілі гаспадыню за працу, яна мусіла дбаць пра чысціню ў сям'і.

***— Бачым таксама цікавыя боты.***

— У нашай Зале сустрэнем боты паваеннага часу, калі людзі не мелі сродкаў да жыцця. З ботамі была вялікая праблема. Тут бачым боты зробленыя з гумовай шыны ад аўтамабіля і скураных рамянёў. Вучні часта параўноўваюць свае прыгожыя боцікі да гэтых і здзіўляюцца, як у іх можна было хадзіць.

***— Да чаго даўней выкарыстоўваліся іншыя цікавыя экспанаты?***

— Вось, напрыклад, шчотка для часання льну, канапель. Даўней у хаце дзяўчаты мусілі самі падрыхтаваць адзежу. Яны сеялі лён, каноплі, якія пасля трэба было намачыць, высушыць, церці пры дапамозе церніцы і потым такой шчоткай вычэсваць валакно з цвёрдай кастрыцы. Такім чынам атрымоўваліся ільняныя ніці, з якіх ткалі бялізну і пасцель.

***— Ці людзі жыва цікавяцца Залай?***

— Больш цікавасці мы назіралі ў пачатку дзейнасці Залы. Прыходзілі гімназісты, вучні пачатковай школы, дзеці з садка. Заглядалі таксама людзі, якія падарылі свае экспанаты. Іх цікавіла як мы выкарысталі іх рэчы (усе былі задаволены). Хатку наведваюць вучні іншых школ, напр. з Нарвы, Залук, Міхалова, Заблудава. Тры разы наведала нас тэлебачанне з Беластока і Кракава (яны ў нашай Зале запісвалі калядкі ў выкананні „Расспяванага Гарадка"). Было некалькі экскурсій, напр. літаратараў, пенсіянераў. У час канікулаў наведалі нас прыватныя асобы, якія цікавіліся нашай культурай і гісторыяй. Адна асоба пісала нават дысертацыю з выкарыстаннем нашай Залы.

***— Ці ў Зале знаходзіцца спіс гасцей, якія яе наведалі?***

— Так, маем памятную кніжку. Мы прапануем гасцям адзначыць сваю прысутнасць і падзяліцца ўражаннямі. Кніга таўсцее з году ў год і гэта нас цешыць.

***— Дзякуем Вам і ўсім, хто памагаў паказаць нам, маладым, што трэба захоўваць сваю гісторыю і культуру, якая часта дрэмле ў непрыкметных і прызабытых прадметах.***

Тэкст і фота:
Аня ТРАХІМЧЫК,
Лукаш ЗІНЕВІЧ,
Оля КАРПЮК,
(пад кірункам настаўніцы
Альжбеты РАМАНЧУК)

# Музыка з кайфам

## Гомельскі рыцар — Андрэй Мельнікаў

Музыка гэта вялікая тайна, але часам бывае яна спосабам жыцця, а часам для некаторых становіцца неабходнай як паветра. Такім асаблівым выпадкам з'яўляецца бард, герой цяперашняга аповеду.

Калі ў радыёперадачы пускаю песні гэтага барда, заўсёды падкрэсліваю, што гэта адзін з самых плённых мастакоў слова і музыкі. А называецца ён Андрэй Мельнікаў. Адкуль у мяне такое меркаванне? Дастаткова глянуць на багацце альбомаў: касет, дыскаў, нават відэазапісаў. Мельнікаў быў для мяне ўвасабленнем барда з моманту, калі ўпершыню я пабачыла яго на фестывалі „Бардаўская восень". Тады мне здавалася, што хаця ён бард „кроў ад крыві", адначасова з'яўляецца альтэрнатывай для ўсіх бардаўскіх сцэнаў. Мае ён у сабе незвычайную атмасферу. Непаўторнасць і арыгінальнасць гэта словы, якія ў ста працэнтах апісваюць яго асобу, але зразу трэба дадаць, што прытым суіснуе салодкая архаічнасць гукаў.

Сёння добра ведаю, што Андрэй Мельнікаў гэта не толькі бард з бельскіх „Бардаў", але перш за ўсё паклоннік гістарычных водгукаў у творчасці. Перш за ўсё трэба яго асацыяваць з фэстам „Аршанская бітва", бо гэта адзін з асноўных бардаў, які словамі і музыкай размалёўвае гістарычныя карціны, вобразы бітваў, лёсы рыцараў, але і звычайных людзей, у якіх ёсць свае праблемы проста з-за таго, што жывуць яны на свеце. Немагчыма ў творчасці Мельнікава не знайсці чагосьці бліжэйшага нашаму сэрцу. Нават калі ў слухачоў няма патрэбы слухаць пра бітвы і рыцарскі шлях, можна ўключыць песню пра каханне, пра славутую вядзьмарку… і яе ведзьмака. Не палохайцеся, легендарныя з'явы гэта таксама частка гісторыі народа і яго культуры.



У ліку некалькіх альбомаў напэўна знойдзецца нешта цікавае сабе. Альбомы Мельнікава выразна адрозніваюцца ад іншых, бо гэты бард-паэт апрацаваў свой арыгінальны правапіс! Хаця не намаўляю пісаць па мельнікаўскіх законах, але варта ведаць, што і ў моўным плане культура беларускага народа вельмі багатая.

i_basovka@o2.pl

## Польска-беларуская крыжаванка № 23




Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 19:

Вус, Ілона, раслінка, рэклама, араб, акно, ла, баран. Рэха, самка, слон, сіла, лімон, донар, Ала, на, збан.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі: **Юстына Анішчук, Дыяна Свірыдзюк** з Чыжоў, **Ася Стоцкая, Марыёля Анішчук, Юстына Тамашук, Караліна Шумарская** з Дубін, **Альжбета Сідарук** з Новага Корніна, **Караліна Бароўская** з Бабікаў, **Паўліна Юрчук** з Белгімназіі ў Гайнаўцы. Віншуем!

Віктар ШВЕД

## Наш Юбілей

*Да паўстагоддзя творчай працы Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа"*

*Пад Белавежай, на Падляшшы,*
*Мы аб'яднаны пажыццёва:*
*З айчынаю малою нашай*
*І з беларускім родным словам.*

*Здабыткаў многа ў нас трывалых,*
*Павінны гэтым ганарыцца,*
*І безліч творчага запалу,*
*І мар, якім каб толькі збыцца...*

*Планаў яшчэ ў мяне багата,*
*Розных нядзейсненых імкненняў.*
*У паўстагоддзі мой пачатак*
*Аднак ніколі — завяршэнне.*

*Нёс творчую я эстафету*
*Надта напорыста і штодзень.*
*Юным перадаю паэтам:*
*— Нясуць яе хай да стагоддзя!*

*Беласток, 8 чэрвеня 2008 года.*

Дзмітры ШАТЫЛОВІЧ

## Апраўданні

*Суд апраўдаў няшчаднага бандыта,*
*Які людзей нявінных мардаваў,*
*Калі да іх прыходзіў ён з візітам,*
*Як нечаканы госць, як ваўкадаў.*

*Паліў жанчын з дзяцьмі ў іх уласных хатах,*
*Бо ў іх былі іконы на сцяне,*
*Бо ў праваслаўных бачыў супастатаў,*
*Як Дон-Кіхот у ветраным млыне.*

*Забіў у лесе ля Старых Пухалаў*
*Узятых сілай трыццаць вазакоў.*
*А па дарозе мардаваў удала,*
*Без сораму і ўдоў, і старыкоў.*

*І суд цяпер сказаў, што ён нявінны,*
*Бо за айчыну ён аддаў жыццё,*
*Усе яму паклоны біць павінны,*
*Мець да яго адвагі пачуццё.*

*Бо ён калісь змагаўся з акупантам,*
*І ксенафобам стаў ён у журбе,*
*Шукаў усюды розных дыверсантаў,*
*І мог рабіць памылкі ў барацьбе.*

*Злачынцамі ў Катыні часта страшаць*
*І іх яны не могуць апраўдаць.*
*А вінных халакосту на Падляшшы*
*Апраўдваюць яны ў сваіх судах.*

*Іх прозвішчамі вуліцы назвалі,*
*Аб іх геройстве трубіць інтэрнэт,*
*Маўчаць, як да дзяцей яны стралялі,*
*Каб кожны беззаганны меў партрэт.*

Альжбета РАМАНЧУК

## Дзед Сямён

*Верш прысвячаю дзядулю Сямёну Каспэруку, які нарадзіўся 1.09.1915 года ў Баранавічах*

*Прыходзіць і на нас час*
*трывожны.*
*Бегай, шукай, лічы...*
*Жыццё хутка бяжыць.*
*Сядзь, адпачні, Сямёнка,*
*зірні ў аконца.*
*Прымпомні*
*любоў, родную вёску,*
*як на шлюбе трымаў свечку з воску.*
*Не адыходзь, наш дзядуля,*
*у нябёсы!*
*Ты нам паказаў драўляныя калёсы,*
*як святкаваць, і сенакосы.*
*Ад Цябе мы знаем вясковае жыццё.*
*А Ты...*
*Прызабыў тое ўсё...*

# Вялікае свята Вялікдзень

Ніна БРУЧКО




**Цяпер...**

Прайшло пару дзесяткаў гадоў. Сёлета Вялікдзень быў самы позні. На дварэ ўжо вясна: многа сонца, летняе паветра, а сады пакрыты белай квеценню, як аблітыя малаком. У прыхатніх гародчыках зацвілі цюльпаны і іншыя кветкі. Рэдка бывае такая прыгожая, цёплая пагода. І вось мы з сястрой Надзяй рашылі сёлета пасвяткаваць Вялікдзень, як калісьці з бацькамі, у Плёсках. Перад святам паехалі ў вёску, памылі і ўпрыгожылі кветкамі і лампадкамі магілы бацькоў і бабулі, прыбралі Надзіну хату-дачу і ў вялікую суботу прыгатавалі пасху. Ноччу пайшлі ў храм маліцца. Цяжка было вачам паверыць — так маленька людзей і толькі ўсе лаўкі пад сценамі царквы заняты старэйшымі жанчынамі, некаторыя з якіх ужо з палачкамі. Пасля завяршэння службы жанчыны, не спяшаючы, выйшлі з маленькімі кошычкамі перад храм, сталі паўкругам. Выйшлі і мы з сястрой, таксама з маленькім кошычкам. Не трэба было спяшацца — месца многа, кошыкаў мала.

Штосьці сціснула за грудзі. Так мала знаёмых твараў засталося. Нішто не прыпаміна́ла даўняга часу майго дзяцінства.

Пасху елі мы ў дзве, са смуткам, як шэсць гадоў таму назад, таксама ў такі позні Вялікдзень — разгаўляліся мы пры гэтым самым стале пасхальным снеданнем. Ды тады было нас чацвёра — мама і Грыша, Надзін муж, якіх сёння няма ўжо ў жывых.

У другую гадзіну пайшлі мы на паабедннюю багаслужбу. Зноў так мала людзей, мо трохі больш прыезджых. Толькі ў другі святочны дзень многа людзей наехала на могілкі, каб пасвяціць магілы сваіх блізкіх, задумацца, прыпомніць мінулы час, калі ўсе мы былі разам. Васіль з Плёскаў казаў: было кіба з пяцьдзесят самаходаў, людзей поўна, кветак і палаючых лампадак цэлае „мора". А сонца грэла як у ліпені, як па заказе тых, хто чакаў, каб у гэтым, другім ужо месцы, святкаваць Вялікдзень. І на трэці дзень многа аднавяскоўцаў святкавала „на гары", на могілках. Ва ўсе дні на вуліцы пуста, няма рогату дзяцей, толькі дзе-нідзе на лаўках старэйшыя сядзяць.

Мы з сястрой у другі, цёплы, сонечны дзень задумалі наведаць нашы даўнія слядочкі — пабачыць новы выгляд Пескаў і свой лес Грыднісак. Шпацыравалі, прыпаміналі і слёзку выціралі. Калі мы ішлі назад, забралі нас у госці Надзя з Васілём, нашы сябры, прыяцелі, якія жывуць на Песках. Елі пры стале, выпілі па кілішачку нямецкай добрай гарэлачкі і давай успамінаць:

— Няма ўжо і следу сцежкі, якою хадзілі напрастакі на сенакос, у Канюкі, а мы дзеці — на раку Нарву купацца. І крыжоў на полі няма, да якіх у Зэлёнэць прыходзіў хрэсны ход. Памятаю прыгожа прыўкрашаныя дзяўчатамі тры крыжы і ля іх маленне ўсіх жыхароў нашай вёскі, — пачала я.

— Цяпер у нас няма працэсіі, вёска вялікая і не было б каму хадзіць з канца Пескаў аж да крыжа пры шашы — усе старыя, хворыя. Не выносяць ужо і сталоў, адкуль забаранілі ўлады ПНР. Усё прапала. У суседніх вёсках, хаця і няма працэсіі, сталы выносяць, бацюшка заходзіць памаліцца, а ў нас — не, — сказаў Васіль. — А калі наконт крыжоў, дзеравяны крыж і каменны цяпер стаяць побач на вуліцы, у канцы Пескаў. Іх перасунулі сюды, калі рабілі вуліцу ў вёсцы, бо стаялі яны як і вялікая вярба пасярод вуліцы. Каменны крыж паставілі мае прадзеды Ліяшукі, бо тут у тыя часы быў канец вёскі. А гэтых, што на полі, дзеравяных, даўно ўжо няма.

— Частуйцеся, дзяўчаты, яды поўна, і пасха ўдалася, смачная, — шчыра запрашала гаспадыня. — Каб такая была за майго дзяцінства! Памятаю, у нас дзяцей было пяцёра, у хаце бедненька, святочны пірог мама пякла з пытляванай жытняй мукі. Укіне дрожджаў, уліе кіслага малака, каб добра пірог падрос і скурка не аддзялялася, а замест яечак дасць варанай прасянной кашы і піражок жоўценькі-жоўценькі… А які смачны! Што ж, у тыя гады людзі гадавалі па пяць-сем курак, не тое што цяпер…

— І пасцілі! — уключылася мая сястра.

— Цяперака таксама посцім, толькі інакш, а тады з прымусу быў пост доўгія месяцы, скварачка была рэдка, — працягвала свой успамін Надзя.

— А ты, Ніна, пісала ў „Ніве" пра плёскаўскіх „грыбоўцаў", — звярнуўся да мяне Васіль. — Вось я табе раскажу адну гісторыю пра іх. Мне апавядаў калісьці дзядзька Рыгор з Пескаў, недалёкі сусед. Старэнькі ўжо быў, ды памяць меў добрую. Жыў амаль сто гадоў. Было гэта за санацыі. У Грыбоўшчыну да прарока Ільі бегалі плёскаўскія мужыкі — чатырох з Мацейкаў і адзін з Пескаў. Некаторыя з іх і жанок за сабой цягнулі, а адзін і дзяцей. Захацелі жыць па-божаму, справядліва, стаць святымі. Прарок наказваў ім: не чапай нічога чужога, а калі што ўкраў, аддай, інакш цэлую вечнасць будзеш насіць той цяжар на сваіх плячах! Аднойчы звярнуўся да яго адзін з мужыкоў: „Прарок, што мне рабіць: пазычыў я літар гарэлкі знаёмаму, а ён зараз жа ўмёр, я ж стратны?" А прарок яму на тое: „Добра, што памёр, іначай ты яму і другі літар пазычыў бы, была б падвойная твая страта!" Навукай прарока хваліліся мужыкі ў вёсцы. Казалі: ён святы, і пасля смерці ўваскрэсне, як Ісус Хрыстос. Кляліся, што прарок наказы, якія перадаваў сваім верным, атрымліваў ад Бога, з якім быў удастоены гаварыць. Мы самі чулі не раз, як „святы" ўзлазіў на стрышок сваёй хаты і гутарыў з Богам, толькі неразборліва для нас грэшных. Адзін з мацейкаўскіх мужыкоў ужо адчуў сябе „святым" і дастойным, як вучыў іх прарок, паляцець у неба, як анГел; трэба толькі ўзлезці высока і махаць рукамі, а яны зменяцца ў ангельскія крылы. Чалавек святочна апрануўся, узлез на шпіхер, памахаў рукамі і... замест у неба, паляцеў на зямлю. Шчасце, што шпіхер быў нізенькі, а лезці вышэй мужык не адважыўся. Аднойчы сабралася чатырох мужчын (невядома, хто гэта быў) і рашылі „распяць" прарока, каб пераканацца аб яго святасці і ўваскрэсенні. Перапалоханы „святы" ўцёк у поле, схаваўся ў пустую картапляную яму, накрыўся саломаю і такім спосабам уратаваўся. А як пазней аказалася, узлезшы на стрышок, „святы" цягаў валкаўніцай па драбіне аж рэха неслася, каб ягоныя паклоннікі ў хаце чулі яго размову з Богам. У адной з недалёкіх ад нашай вёсак мужык так моцна увераваў у прарока і сваю святасць, што аднойчы сеў на белую кабылу і спрабаваў паехаць па паверхні вады ракі Нарвы, як хадзіў Ісус Хрыстос! На шчасце суседзі выцягнулі жывымі і „святога", і кабылу. Хутка плёскаўскія мужыкі пераканаліся ў сваёй бязглуздзіцы, пакінулі верыць у святасць прарока ды сваю і пачалі жыць як іншыя сяляне. Адзін з іх пачаў служыць у сваёй царкве, а толькі адзін з мацейкаўскіх „святых", аб якім ты пісала, астаўся быць верным прароку нат па яго смерці і да канца свайго жыцця! — закончыў Васіль.

Вечарам і мы з сястрой паспяшалі дамоў. Падзякавалі гаспадарам і запрасілі іх на сустрэчу летам у сестрыную хату. А Васіль паабяцаў расказаць нам пра іншыя цікавыя здарэнні з жыцця даўніх жыхароў нашай і не толькі нашай вёскі.

# Фестывальная мазаіка

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

— No już tak pięknie śpiewali, że po prostu słów brakuje!

Такімі простымі словамі беластоцкая публіка каментавала заварэнне кожнага дня XXVII Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі „Гайнаўка-2008”. Сапраўды, прыгажосць і майстэрсва фестывальных хароў пераносіла слухачоў у іншае, неназоўнае вымярэнне. Асабліва ў час конкурсных выступленняў, калі кожны хор мае нагоду запрэзентаваць свой стыль і характар. І эмоцыі, якія ў малітоўным спеве найважнейшыя. Кожны з трох дзён, у час якіх у беластоцкай філармоніі запрэзентаваліся 22 хары з Еўропы і Азіі, ставаўся не толькі мастацкай, але і духоўнай падзеяй. Праўда, найвышэйшы ўзровень і прафесіяналізм (такое меркаванне замацавалася за фестывалем Міколы Бушко) застаўляюць шукаць яшчэ большай дасканаласці. Апошняя справа бывае складанай. Выканаўцы, якія засяроджваюцца на ўзорнай карэктнасці, часта губляюць малітоўны змест твора. Пра такіх нашы слухачы кажуць, што яны „nie czują ducha prawosławia”! Такі погляд лёгка звяргнуць, дарэчы, такое паказаў і сёлетні фестываль. Ад пачатку да канца маім фаварытам быў Акадэмічны хор „Мазаіка” з Магілёва (пераможца ў катэгорыі аматарскіх свецкіх хараў). І не ідзе тут пра нацыянальны, рэдка прысутны ў нашых харыстаў, рэпертуар (у іх выкананні прагучалі творы беларускіх кампазітараў Туранкова, Куліковіча, Дзянісавай). У памяці і душы засталося іх выкананне „У малітвах неусыпаючую” Сяргея Рахманінава, якое магілёўская моладзь выспявала з уражлівасцю і аўтэнтычным драматызмам. У ім адчувалася скарга на нашу зямную бяздарнасць, колькі боль і бездапаможнасць. Жанэта Ялфімава, узнагароджаная хрустальным кубкам для найлепшага дырыжора, ад гадоў звязаная з Фестывалем духоўнай музыкі „Магутны Божа”, які адбываецца ў Магілёве.



Дзіцячы хор „Комітас” з Ісфагана (Іран)

Падобнае захапленне выклікаў Хор Радыёвяшчання і тэлебачання Малдовы „Capella Moldova” з Кішынёва, які з адчуваннем малітоўнасці праспяваў творы малдаўскіх і рускіх кампазітараў. Хор існуе з 1944 года (з 1987 года пад кірункам Валянціна Будзілеўскага) і ў першую чаргу выконвае харавую музыку малдаўскіх кампазітараў. Беластоцкая публіка палюбіла Малдавію з-за салістаў. Валерыя Кажакару (які выканаў твор П. Часнакова „Блажэнны муж”) заставіла яна спяваць „на біс” і не хацела адпусціць са сцэны. Малдаване заваявалі ўзнагароду старшыні Польскага тэлебачання і міністра культуры РП (у катэгорыі прафесійных хароў). Сярод знакамітых выканаўцаў запамятаўся таксама Хор Армянскага тэлебачання з Ерэвана „Avedis”. Арменія — адна з першых краін свету, якія прынялі хрысціянства. Гэтая нота старажытнасці, якая спалучае нас з часам Ісуса Хрыста, жыва прысутная ў сучасных царкоўных напевах. Жывы працяг традыцыі назіраем не адно ў царкоўнай музыцы. Армянскую царкоўную сцішаную музыку часта выкарыстоўваюць для музычнай ілюстрацыі галівудскіх прадукцый на біблейскія тэмы.

Кажуць, што колькасць не суправаджаецца якасцю. Заўсёды на фестывалі найбольш хароў з Польшчы. Іх трэба правільна ацаніць найперш за актыўнасць і адкрытасць на царкоўную эстэтыку. У гэты раз здарыўся сапраўдны цуд. Камерны хор Медычнай акадэміі з Вроцлава захапіў усіх — і публіку, і журы. Будучыя медыкі звяргнулі міф пра непераможнасць праваслаўных хароў! Яны апынуліся сярод лаўрэатаў першага месца.

# Бенефіс у добрай цішыні

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

— Сёння ў нас паэзія ідзе нарасхват! — пажартаваў акцёр Рышард Далінскі. Жарт беластоцкага акцёра быў найлепшым каментарыем да складанай сітуацыі, у якой зараз апынулася літаратура і аўтары. Калі ідзе пра наш Беласток, можна сказаць, што сапраўдная цікавасць да літаратуры тут амаль роўная нулю. У час аўтарскіх сустрэч можна прадаць адну, дзве, тры... кніжкі.

Бенефіс Юры Плютовіча не напамінаў ранейшых беластоцкіх бенефісаў. Не было пафасных прамоў, штучнага захаплення чыноўнікаў (якім нават не прыходзіць у галаву купіць кніжку хваленага аўтара), паднябеснай хвальбы, з якой нічога не атрымліваецца. Праблема літаратуры — гэта адсутнасць прамоцыі з боку культурных устаноў, ашчаднасць на аўтарах і літаратурных выданнях. Не зразумець чаму культурныя ўстановы, якія так „ганарацца” паэтам Юры Плютовічам, ці СМІ (апрача Радыё Беласток і „Нівы”) не знайшлі часу, каб разам з таварыствам „Дожэчэ” падмацаваць бенефіс.

З другога боку, бенефіс атрымаўся незвычайна прыгожы і рэфлексіўны. Павіншаваць Юры Плютовіча з’явіліся найперш сябры: літаратары, мастакі, акцёры, журналісты, эколагі, знаёмыя. Сустрэча пачалася 28 мая вечарам, з лёгкім спазненнем, у кафэ „Фама”. Пакуль героя вечара пасадзілі на спецыяльны трон, публіку прывітала „Капэла з Бэтээля” (так завецца сябройскамузычны гурт Беластоцкага лялечнага тэатра). Прэзентацыя пачалася з фільма Войцеха Каранкевіча, у якім жыхары Беластока выказваліся на тэму паэта і яго творчасці. Глядач, між іншым, даведаўся, што Юры Плютовіч вядомы ў Беларусі. Сапраўды, вершы ў перакладзе на беларускую мову друкаваліся ў прэстыжных мінскіх часопісах „Крыніца” і „Дзеяслоў”. Паэт з 2004 года супрацоўнічае з „Нівай”. Менавіта эсэ пра літаратурны кантэкст Вялікага княства Літоўскага і ролю беларускай шляхты ў фармаванні польскага рамантызму і яго паслядоўнасці, прысутныя ў мышленні палякаў у наш час, паэт прачытаў замест прамовы. Моцны інтэлектуальны зарад паўплываў на атмасферу ўсяго мерапрыемства, на якім запанавала ўрачыстая цішыня і засяроджанасць на слове. Між віншаваннямі і прамовамі вёўся аўкцыён кніжкі „Drzazgi” знамянітым Рышардам Далінскім. У кніжку ўвайшло 30 вершаў, напісаных рукой паэта, адбітых на ксераксе і пераплеценых. Юбілейны тыраж колькасцю ў 30 экземпляраў фактычна разышоўся нарасхват, а сам арыгінал быў прададзены за дзвесце злотых. Аўкцыён дапоўнілі ілюстрацыі мастака Здзіслава Пэрчынскага, якія ўзніклі на матывах вершаў Ежы Плютовіча ў час самога бенефісу. Былі таксама традыцыйныя матывы, як „Дзядоўская балада” Яна Камінскага ці анекдот (разам з фатаграфіяй) Віктара Волкава. Музычны бок мерапрыемства склалі французкія песні ў выкананні беластоцкай акцёркі Агнешкі Мажэйка.





І самае галоўнае! З нагоды бенефісу таварыства „Дожэчэ” выдала дзевяты ўжо том паэзіі Ежы Плютовіча „Zapomniana wojna (Sierpień. Kołyska)”. Выданне прафінансавала Гарадская ўправа, Гарадское ачышчальнае прадпрыемства, часопіс „Charaktery” з Кельцаў, а сярод спонсараў мерапрыемства была таксама наша „Ніва”.

Бенефіс з веданнем справы і гумарам вёў беластоцкі акцёр Марк Тышкевіч. Хоць выступленні і віншаванні цягнуліся за тры гадзіны, не адчувалася стомы, наадварот, цудоўна было пабываць у добрай цішы і прыгожай кампаніі.

— Бо творчасць Юры Плютовіча гэта цэлебрацыя цішыні, — адзначыў у час выступлення філасаф і літаратар Яцэк Брэчка, вучань паэта.

# І РЭГІЯНАЛЬНЫ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІ ЭКАНАМІЧНЫ ФОРУМ ЭКАНАМІЧНАЯ ВЫСТАВА Ў ГАЙНАЎЦЫ

**19 чэрвеня 2008 года Музей і Цэнтр Беларускай культуры ў Гайнаўцы (вул. 3 Мая, 42)**

Арганізатары І Рэгіянальнага Беларуска-Польскага эканамічнага форуму і Эканамічнай выставы ў Гайнаўцы інфармуюць, што 19 чэрвеня 2008 года ў Гайнаўцы адбудзецца 1-ы Рэгіянальны Беларуска-Польскі эканамічны форум і Эканамічная выстава з удзелам беларускіх і польскіх прадпрыемстваў з Брэсцкай і Гродзенскай абласцей Беларусі і Падляшскага і Люблінскага ваяводстваў Польшчы. У мерапрыемствах прымуць удзел гаспадарчыя суб'екты, якія прадстаўляюць розныя галіны гаспадаркі:

- машынабудаванне (трактары, аўтобусы, грузавыя аўтамабілі);
- банкі і інвестыцыі;
- хімічная і нафтахімічная прамысловасць;
- вытворчасць спажывецкіх тавараў;
- турызм;
- сувенірная прадукцыя.

Мэтай Форуму і Выставы з'яўляецца спрыянне развіццю ўзаемакарысных гаспадарчых кантактаў паміж прадпрыемствамі прыгранічных рэгіёнаў Беларусі і Польшчы.

**Беларуска-Польскі гандлёвы абарот у 2003-2007 гадах увазрос 4,1-кратна**




**Адкрыццё Форуму і Выставы адбудзецца ў Музеі і Цэнтры Беларускай культуры ў Гайнаўцы 19 чэрвеня г.г. а 11.00 гадзіне.**

У гэтым дні адбудуцца **Беларуска-Польскі рэгіянальны семінар па гаспадарчым супрацоўніцтве, прэзентацыі** Брэсцкай і Гродзенскай абласцей Беларусі, Падляшскага ваяводства, свабодных эканамічных зон абедзвюх краін, еўрарэгіёна «Белавежская пушча», Аўгустоўскага канала, а таксама будзе арганізавана **«Біржа кантактаў»**, у ходзе якой каля стэндаў і экспазіцый можна будзе атрымаць дэталёвыя адказы на ўсе Вашы пытанні непасрэдна ад вытворцаў тавараў і паслуг, а таксама распачаць супрацоўніцтва.

**Выстава будзе адкрыта з 11.00 да 17.00 гадзін.**

**Суарганізатарамі Форуму і Выставы з'яўляюцца:**

**З польскага боку:**

— Маршалак Падляшскага ваяводства
— Стараста Гайнаўскага павета
— Бургамістр Гайнаўкі
— Беластоцкая гандлёва-прамысловая палата
— Польска-Беларуская гандлёва-прамысловая палата
— Еўрарэгіён «Белавежская Пушча»

**З беларускага боку:**

— Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт
— Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт
— Беларуская гандлёва-прамысловая палата
— Гандлёвая служба Пасольства Беларусі ў Польшчы
— Генеральнае консульства Беларусі ў Беластоку

У выпадку зацікаўленасці наведваннем Форуму і Выставы, устанаўленнем падчас яе бізнес-кантактаў, просім звяртацца:

— Гандлёвая служба Пасольства Беларусі ў Польшчы (тэл.: (22) 742 09 66, -75, -76, факс: 742 09 80, e-mail: poland@belembassy.org);
— Генеральнае консульства Беларусі ў Беластоку (тэл.: (85) 644 99 40, 744 63 28, факс: 744 66 61, e-mail: bialystok@belembassy.org);
— Управа горада Гайнаўкі, Аддзел эканамічнай палітыкі (тэл. (85) 682 20 16, 682 64 45, факс: 682 29 94, e-mail: hajnowka@hajnowka.pl).

**САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!**




Прысутнасць у сусветным павуцінні — гэта свайго роду прызнак сур'ёзнасці, бо гавoрыць аб тым, што нейкая арганізацыя парупілася пра тое, каб аб яе існаванні даведалася як мага больш людзей. Інтэрнэт ужо даволі трывала ўвайшоў у нашае жыццё, але яшчэ не настолькі звычайным ў ім ёсць прадстаўніцтвы маленькіх беларускіх вёсак. Таму аб адной з такіх, якая існуе не толькі ў рэальнай, але і ў віртуальнай прасторы, мы сёння пагаворым.

Сайт вёскі Чыкі, што на Міншчыне, месціцца на адрасе http://czyki.at.tut.by. Трэба адзначыць, што выглядае ён вельмі прывабна, многія гарадскія сайты яму няроўня. З левага боку, як звычайна, знаходзяцца выйсці да іншых старонак віртуальных Чыкаў, пасярэдзіне — асноўная інфармацыя, а справа — банэры і апытанні. Дарэчы, у апытаннях нам прапануецца расaвесці пра сваё веданне Чыкаў адным адказам — ведаем мы пра іх ці не.

Калі хто не ведае, што гэта за такія Чыкі, а такіх людзей, мяркую, значна больш за ўсіх астатніх, то ім варта будзе прачытаць невялікі тэкст, які прэзентуе вёску. „Мала хто што чуў пра Чыкі, мала хто ведае, што йснуе такая вёска на Койданаўшчыне... А між тым, гэта ці не найпрыгажэйшае месца ў сьвеце (ня варта спрачацца, гэта мая прыватная думка), — піша пра яе аўтар сайта, пра якога мы можам даведацца на старонцы „Вэб-майстра". — Пад час пошукаў у Сеціве я ніколі не знаходзіў аніякіх згадкаў аб вёсцы. На большасьці мапаў яе таксама няма. Ну так, гэта не такі ўжо вялікі цэнтар. Але для мяне гэта трохі крыўдна, бо хаця сам я зь Менску, а ўсё ж Чыкі — гэта вёска, зь якой я родам. Там нарадзіўся мой бацька, дзед, прадзед і гэтак далей. У дзяцінстве я штогод бавіў там час улетку. І вось неяк шпацыруючы па лесе я разважаў аб жыцьці. Плёнам тых развагаў сталася рашэньне стварыць невялічкі сайт аб вёсцы".

Колькасць рубрык вясковага сайта даволі неблагая. Праўда, не ўсе з іх напоўненыя вялікай інфармацыяй. Некаторыя ж як „Пачатак" і „Аб вёсцы" ўвогуле з'яўляюцца копіямі адна адной.

Затое рубрыка „Дзе яна" падрабязна давядзе нам, дзе менавіта месціцца Чыкі і як да іх дабрацца ад Мінска. Акрамя таго, аўтар, якога завуць Андрэй Кміт, паклапаціўся і пра карту, дзе можна пралічыць адлегласць вёскі ад іншых паселішчаў.

З іроніяй падае стваральнік сайта сваё няведанне гісторыі роднай вёскі. І яна, гэта іронія, неяк прымушае прабачаць яго за не надта апантанае зацікаўленне мінуўшчынай сваёй малой радзімы.

Найбольш прыгожай на цэлым сайце з'яўляецца старонка „Здымкі". Знятыя краявіды ў наваколлі Чыкаў сапраўды ўражваюць сваёй прыгажосцю. Ад іх нібыта вее нейкім спрадвечным спакоем і прыродным прыцягненнем.

„Навіны сайту" не абнаўляліся ўжо даўно. Праўда, на наведванні віртуальных Чыкаў гэта ніякім чынам не адбілася. Калі зазірнуць на старонку „Гасцёўня", то ўбачым там мноства паведамленняў, якія з большага выказаныя ў прыхільным тоне і іх аўтары жадаюць сайту поспеху і развіцця.

Што ж тычыцца падобных беларускіх „вясковых" сайтаў, то многія з іх таксама прадстаўлены ў „Чыках". Каб у гэтым упэўніцца, трэба адкрыць старонку „Вёскі й мястэчкі".

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**

## СПОРТ

# Беларусь, беларусы...

**На травеньскай хвалі**

Выбіраючы лепшых беларускіх спартоўцаў месяца, галоўным крытэрыем вылучэння з'яўляецца важкасць дасягнення на міжнародным роўні, ці ў параўнанні з ім. Пры аналагічнасці вынікаў трэба ўлічваць таксама папулярнасць таго ці іншага віду, ступень канкурэнцыі і сенсацыйнасці, а таксама іншыя розныя фактары, хаця б стабільнасць выступаў. Для прыкладу, Кацярына Карстан практычна заўсёды вялуе лепш за іншых. Прапануем увазе топліст тых, каго „вынесла на хвалі" ў траўні. Россып узнагарод на некалькіх чэмпіянатах не дазволіў вылучыць усіх вартых індывідуальна. Але кампенсуем гэта камандавым наміінаваннем.

Найперш варта адзначыць зборную па веславанні на байдарках і каноэ. На чэмпіянаце Еўропы, што прайшоў у італьянскім Мілане, наша мужчынская каманда здабыла ажно 7 медалёў (4 залатыя, 1 срэбраны і 2 бронзавыя). Па суме выступаў Беларусь заняла 3-е месца ўслед за грандамі ў гэтым відзе — Венгрыяй і Расіяй. Ззаду засталіся ажно 36 краін. Парадавалі і беларускія самбісты, якія з першынства кантынента ў сталіцы Грузіі Тбілісі прывезлі ажно 13 узнагарод. На рахунку ж айчынных батутыстаў тры прызавыя месцы першынства Старога свету.

**1. Андрэй і Аляксандр Багдановічы** (веславанне) на каноэ-двойцы як і летась сталі чэмпіёнамі на кіламетровай алімпійскай дыстанцыі.

**2. Вячаслаў Модэль і Мікалай Казак** (скачкі на батуце) вызначыліся золатам на чэмпіянаце Еўропы ў сінхронных скачках.

**3. Дзмітрый Каспяровіч** (гімнастыка) на чэмпіянаце Еўропы ў швейцарскай Лазане заняў другое месца ў апорным скачку. А наша дружына, якая спакваля ўздымаецца з заняпаду, у фінале камандавага турніру стала чацвёртай.

**4. Вадзім Дзевятоўскі** (лёгкая атлетыка) выйграў прэстыжны этап Супер Гран-пры IAAF у кіданні молата, паказаўшы прытым трэці вынік сезона ў свеце.

**5-6. Сяргей Мартынаў** (кулявая стральба) зрабіў сабе цудоўны падарунак да 40-гадовага юбілею, выйграўшы этап Кубка свету ў стральбе з малакалібернай вінтоўкі лежачы з адлегласці 50 м. Гэта ўжо 18 (!) медаль алімпіёніка ў кар'еры на аналагічных турнірах.

**5-6. Андрэй Гардзееў** (лёгкая атлетыка) здабыў эфектную вікторыю на традыцыйным марафоне ў Кракаве. Бабруйскі бягун не толькі апярэдзіў бліжэйшага канкурэнта амаль на тры хвіліны, але і ўсталяваў новы рэкорд трасы.

**1. Таццяна Пятрэня** (скачкі на батуце) стала бронзавай прызёркай у індывідуальным фінале еўрапершынства.

**2. Кацярына Карстан** (акадэмічнае веславанне) упэўнена выйграла этап Кубка свету ў Мюнхене ў заездзе лодак-адзіночак на 2000 м.

**3. Вольга Гаварцова** (тэніс) выйграла першы ў сваёй кар'еры турнір ВТА, перамогшы ў фінале парных спаборніцтваў у турэцкім Стамбуле разам з амерыканкай Джыл Крэйбас. А таксама ўдала стартавала на „Ралан Гаросе" ў Францыі.

**4. Іна Жукава** (мастацкая гімнастыка) стала абсалютнай пераможцай этапу Гран-пры ў іспанскім Бургасе ў шматбор'і і выйграла ўсе чатыры фіналы ў асобных відах. На турніры, праўда, не выступалі мацнейшыя гімнасткі Украіны і Расіі.

**5. Вікторыя Паўловіч** (настольны тэніс) стала першай пераможцай турніру серыі „Pro Tour", што ўпершыню прайшоў у сталіцы Беларусі. Дадам, што аналагічнага поспеху дасягнуў і Уладзімір Самсонаў.

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# Вандроўка па ўзбярэжжы Жарнавецкага возера

Міхась КУПТЭЛЬ



Не толькі беларусы Трыгарада і Прушча-Гданьскага, але і астатнія жыхары гарадскіх блокаў выбраліся 22 мая, на Божае Цела, на традыцыйную турыстычную вандроўку. Відаць, святочны дзень — добрая нагода адпачыць на ўлонні прыроды, нягледзячы на трывожныя прагнозы надвор'я. Але было наадварот. Сонечнае надвор'е прывітала нас у ваколіцах Жарнавецкага возера праўдзівай майскай вясной.

У гэтым годзе маршрут вандроўкі, па дамоўленасці са старшынёй „Хаткі" Ленай Глагоўскай, падрыхтаваў аўтар гэтага допісу. Вандравалі мы па ваколіцы аднаго з большых на ўзбярэжжы азёр — Жарнавецкага возера, слаўнага тым, што некалі мела тут паўстаць першая ў Рэчы Паспалітай атамная электрастанцыя. У васьмідзесятыя гады прошлага стагоддзя ўсё было падрыхтавана да будовы, але пасля чарнобыльскай катастрофы сітуацыя змянілася і ў выніку рэферэндуму народ вырашыў, што ніякі атам яму непатрэбны. Затое працуе гідраэлектрастанцыя характэрная тым, што ўначы запасная энергія пампуе ваду з возера ў спецыяльнае вадасховішча, а ўдзень вада з гэтага вадасховішча цячэ ў возера праз турбіны гідрастанцыі, якія прадукуюць электраток. Замест атамнай электрастанцыі атрымалася асаблівае „перпетуум мобіле".

Наш маршрут быў такі: Гданьск, Сопат, Гдыня, Вейгерова — электрычкай; Вейгерова, Гневіна — на аўтобусе ПКС; Гневіна, Надоле-Скансэн, Чыманова, Лісэва-Вадасховішча — пешшу.

З Гневіна накіроўваемся ў Надоле над берагам Жарнавецкага возера — кутка Кашубшчыны, да кашубскага скансэна. Пішу кутка, бо аказваецца, што невялічкае Надоле было польскім анклавам на заходнім баку возера. Прывітаў нас чаркай віна сам дырэктар Музея Пуцкай зямлі Мірaслаў Куклік, ураджэнец Беласточчыны, беларус з-пад Крынак.

— Як вы тут апынуліся? — пытаю спадара Кукліка.

— У 1986 годзе кончыў я геалогію на Гданскім універсітэце, закахаўся, ажаніўся і застаўся тут над морам.

Жыццёвая дарога, як кажуць кропля ў кроплю падобная да лёсу некаторых удзельнікаў маёвай вандроўкі.

— Гэта дзякуючы нашаму дырэктару паўстаў скансэн у Надолі, — кажа Малгажата Вайцяхоўская, працаўніца музея і заадно праваднік па скансэне.

Пані Малгажата дэталёва пазнаёміла нас з экспанатамі ў скансэне ў кантэксце жыцця нябеднай сялянскай кашубскай сям'і.

Для гасцей, значыць для нас, была падрыхтаваная кухня з гарохавым супам, месца на вогнішча, судна на экскурсію па возеры. Але калі мы падмацаваліся каўбаскамі з грыля, калі разгаварыліся, калі нам было так добра адпачываць пры цёплым сонейку, час мінуў хутка, а капітан судна, не дачакаўшыся нас, адплыў у сінюю даль возера.

Вяртаючыся з Надоля, мы паглядзелі яшчэ ваколіцу Жарнавецкага возера з вышыні 50-метровай вежы, турыстычнага атракцыёна гміны Гневіна. І так надышла пара вяртацца дахаты. Да пабачэння праз год на чарговай турыстычнай вандроўцы.

# Аб рынку ў Гайнаўцы

Андрэй ЯЛОЗА

Ва ўправе горада Гайнаўкі 13 мая адбылася сустрэча гарадскіх улад з мясцовымі гандлярамі. З прадстаўнічай групай васьмі прадпрымальнікаў сустрэліся намеснік бурмістра, двух прадстаўнікоў Камендатуры паліцыі і ўладальніца рынку спадарыня Ажахоўская. Віцэ-бурмістр у сваім выступленні аднёсся да скаргі гандляроў на забарону прадаваць тавары перад брамай рынка. Гэтае рашэнне абгрунтоўваў ён законамі аб ахове публічнага парадку.

У ходзе дыскусіі гайнаўскія прадаўцы скардзіліся, што ім не хапае выгадных месц для гандлю, а ўладальніца рынка пераконвала, што на рынку месца дастаткова. І хаця пад плотам месца для гандлявання абазначанае белай лініяй, аднак прадаўцы неахвотна ім карыстаюцца. Спадарыня Ажахоўская паабяцала таксама не браць аплаты за гандаль у вызначаным месцы. Відаць, яна стараецца пазбегнуць канфлікту з прадаўцамі. Аднак гандляры надалей патрабавалі дазволу на продаж перад рынкам, дзе больш прасторна. Спасылаліся яны на іншыя гарады, між іншым, на Бельск-Падляшскі.

Хаця ў Польшчы абавязваюць аднолькавыя законы, то бурмістр Бельска не забараніў гандлявацць як на рынку, так і па-за рынкам. Інакш справа маецца ў Гайнаўцы, дзе бурмістр забараніў гандаль перад рынкам. На шчасце паліцыя ставіцца да справы са зразуменнем і замест штрафаваць гандляроў, павучае іх. Прадаўцы разумеюць сітуацыю і калі пабачаць паліцэйскіх, пакідаюць забароненае месца.

Прадаўцы далей не выконваюць распараджэння бурмістра аб забароне гандлю перад рынкам, бо там тавар прадаецца найхутчэй. Па серадах няма свабоднага месца нават пад абазначаным плотам. Капітан Мікалай Ляшкевіч сказаў, што калі будзе цесна на вызначаных месцах, то паліцыя не будзе кранаць тых, якія гандлююць перад уваходнай брамай. На вырашэнне справы даў ён тэрмін да 17 мая. Пасля паліцыя будзе штрафаваць за гандаль у недазволеным месцы. Аднак ці гэта вырашыць канфлікт? Найлепшым вырашэннем было б адвядзенне месца на продаж сельгаспрадуктаў з правага боку пляца перад брамай, за што спадарыні Ажахоўскай плацілі б гандляры. Тады не было б канфліктаў, а ўладальніца рынка не была б стратная.

# Назойлівыя хітрыкі

Уладзімір СІДАРУК

Пяць год таму рабіў я закупку ў беластоцкім маркеце і пакарыстаўся банкавым крэдытам. Крэдыт сплаціў я ў назначаны тэрмін за што, разумеецца, атрымаў з Cetelem Bank S.A. у Варшаве падзяку і запрашэнне далей карыстацца іхнімі паслугамі. Не памятаю колькі я заплаціў працэнтаў, але сказаў, што крэдытаў буду асцерагацца, бо гэта адно набіванне камерсантам кішэні. Зараз раблю закупкі з алоўкам у руках і нядрэнна гэта атрымліваецца. Варшаўскі банк памятае аб добрасумленным кліенце і што і раз пасылае мне прапановы браць крэдыт на зручных умовах. Не патрэбны ўжо паручыцелі. Дастаткова запоўніць адпаведны фармуляр і дзесяць тысяч злотых выплачваюць адразу або пераводзяць на банкавы рахунак. Скажыце, даражэнькія, навошта пенсіянеру браць пазыкі, калі нейкі свой грош застаецца ў кашальку? Прасіў я чыноўнікаў (калі пазванілі мне з Варшавы) ліквідаваць мой банкавы рахунак, бо крэдытамі карыстацца не буду. А гэтыя дурніцу чаўпуць, надалей шлюць мне свае прапановы.

Падобна справа маецца з лічбавым Польсатам. Паколькі я іхні кліент і заключыў дамову на „фамілійны пакет", гэтыя рэкамендуюць падпісаць дадатковую дамову на спартыўныя тэлеканалы, каб аглядаць ЕЎРА-2008. Здзелка такая абышлася б мне ў 51,80 зл. месячнага абанементу. Дагэтуль карыстаюся 44 польскамоўнымі тэлеканаламі і 4 з Беларусі і чалавеку майго ўзросту цяжка выбраць праграму. Над гэтым задумваўся Марк Цыбарт у допісе „Навошта плаціць абанемент?" („Ніва" № 21 ад 25 мая 2008 г.). Падобных прыкладаў хоць адбаўляй. Рэкламы, прамоцыі ды іншага віду хітрыкі рэкамендуюць у маркетах, банках ці тэлебачанні. А ўсё дзеля таго, каб абдурыць чалавека. Дзе ж тады нашы прынцыпы хрысціянскай маралі, якія навучаюць: „Любі брата свайго, як сябе самога?"

# Адгаданка

1. скандынаўская дзяржава са сцягам з белым крыжам на чырвоным полі, 2. ніткападобная эластычная пасма расліннага, мінеральнага або штучнага паходжання, 3. металічнае прыстасаванне ў розных механізмах для зачэрпвання, высыпання або разлівання розных рэчываў, 4. жніўная прылада з савецкага герба, 5. адрывісты гук ад удараў, напр. дзятлавай дзюбай у дрэва, 6. адзінка электрычнага супраціўлення, 7. збожжа на хлеб, 8. у роце, вілах, баране, 9. адступленне ад агульнага правіла, 10. самка арла, 11. не цела, 12. вяроўка для перавязвання пярэдніх ног жывёле, 13. метал для стралковых снарадаў, 14. сталіца Туркменістана.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — англійская прыказка.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 18 нумара**

Ака, вока, Гётэ, дзея, дзік, „Іж", мімікрыя, ножны, пена, поп, Сет, сіла, спіца, цыцка, чай.

Рашэнне: **Дзіцячае жыццё гэта лісток паперы, на якім кожны мінак пакідае свой запіс.**

Кніжную ўзнагароду высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*

**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор і карэктура:** Яўгенія Палоцкая.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

**Prenumerata:** III kwartał 26 zł. do 5 czerwca 2008 r; IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. II półrocze 52 zł. do 5 czerwca 2008 r. II — IV kwartał 78 zł. do 5 marca 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.

Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/Warszawa,

Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy" w 2008 roku — 52. **Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł. **Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BANK PEKAO S.A. O/Białystok 38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

**Nakład**: 1 450 egz.

# Прэзідэнцкае захапленне

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

На пальцах адной рукі можна палічыць цэрквы, якіх вонкавы выгляд захаваўся з невялікімі зменамі. Аднак большасць храмаў была разабрана, а атрыманы матэрыял паслужыў для іншых пабудоў. Першымі былі разбураны даўнія цэрквы з былых губернскіх і павятовых гарадоў, тыя, што стаялі на цэнтральных плячах або пры галоўных вуліцах ды і тыя найпрыгажэйшыя, каб сваім выглядам не псавалі выгляду горада. Працэс разбурэння цэркваў дасягнуў апагея ў палове дваццатых гадоў мінулага стагоддзя і працягваўся да выбуху II сусветнай вайны, — такую інфармацыю можна было прачытаць на табліцы, спадарожнічаючай выставе „Праваслаўныя цэрквы на старых паштоўках" у Супрасльскай акадэміі (у Палацы архімандрытаў).

Экспанаваныя паштоўкі паходзяць з унікальнай калекцыі Аляксандра Сасны — намесніка прэзідэнта горада Беластока, сына настаяцеля Рыбалаўскага прыхода. Складваюць яны толькі дзесятую частку калекцыі, якая налічвае каля 1 200 пазіцый. Большасці з паказваных на выставе цэркваў ужо няма. Шмат з іх паказваюць не толькі праваслаўную сакральную архітэктуру з абшараў, якія пасля II сусветнай вайны засталіся па-за межамі Рэчы Паспалітай. На адной з іх, напрыклад, можна ўбачыць царкву ў Борках каля Харкава, дзе сышоў з рэек у канцы XIX ст. лакаматыў з цягніком, на якім ехалі цар Аляксандр III з сям'ёй. Загінула тады некалькі дзесятак людзей. Царская сям'я ацалела. Гэтае здарэнне ўвекавечвае, дарэчы, шмат іншых сімвалаў, напрыклад, крыж у падляшскіх Зачарлянах. Здзіўленне, асабліва ў малады людзей, маглі выклікаць выявы самавітых цэркваў у цэнтрах Сувалкаў, Чанстаховы (гэтая царква стаіць да сёння, толькі з'яўляецца каталіцкім касцёлам св. Якуба), Ружанастоку (царква з пачатку XX ст., сёння тут спортпляцоўка, поле, будынкі) ці ўрэшце Варшавы, а тут перш за ўсё размешчаныя ў цэнтры сталіцы, на Саскім пляцы і на Кракаўскім прадмесці паміж помнікам Мікалаю Каперніку і цяперашняй сядзібай Польскай акадэміі навук (палац Сташыца).

— Найбольш люблю павялічаныя фатаграфіі, бо на саміх паштоўках не відаць так добра дэталяў, — расказваў „Ніве" Аляксандр Сасна, праводзячы нас па выстаўцы ў час яе вернісажу.

На адной з такіх фатаграфій можна ўбачыць, хто на іх апынуўся, што гэта афіцэры, а не радавыя салдаты. На іншай — абразок з-пад царквы ў Аўгустове каля Бельска-Падляшскага, дзе знялі прыбіраючых расійскіх ваеннапалонных на мясцовым могільніку ў атачэнні пільнуючых іх нямецкіх салдат з эскорта. Аляксандр Сасна расказваў:

— Немцы рабілі такія здымкі, бо будынак царквы сімвалізаваў расійскую імперыю. Быў гэта свайго роду доказ перамогі над царом.

I дадаў:

— У II Рэчы Паспалітай знос цэркваў, сціранне слядоў праваслаўя трактаваліся як рэакцыя на больш за 120 гадоў няволі. Толькі цяпер трактуецца іх як элемент архітэктуры, шматкультурнасці Польшчы. Калі ў міжваенным СССР разбіралі цэрквы, бо такая была ідэалогія камунізму, то ў II Рэчы Паспалітай ідэалогіяй было хрысціянства і хрысціяне рабілі братам хрысціянам усходняга абраду тое ж самае, што тады рабілася ў СССР.




Шмат паштовак Аляксандр Сасна набыў на аўкцыёнах у Берліне. Іншыя амаль ва ўсім свеце, а таксама праз аўкцыёны ў інтэрнэце:

— Амаль у кожны горад Нямеччыны раз у месяц або раз у квартал з'язджаюцца калекцыянеры і гандляры з усёй Еўропы. Езджу я туды і са скрыначак, дзе змяшчаецца пад тысячу паштовак, выбіраю тыя з цэрквамі. Шмат паштовак непадпісаных. У мяне зыркі зрок і ўдаецца мне распазнаць шмат такіх паштовак. Распазнаў я царкву ў Аўгустове, бо тая царква выглядае так сама, толькі цяпер абшытая шалёўкай і папраўленая. Атрымаў я ў калядны падавілася вось у Расіі, якія збіраюць выявы цэркваў былой Расійскай імперыі і трактуюць Польшчу як частку тае імперыі ды плацяць нечуваныя цэны. Я збіраю гэтыя паштоўкі, хоць мог бы за іх цану нават памяняць аўтамабіль, але і ведаю, што не забяру іх на той свет. Таму рашыў я ў будучыні ўсю калекцыю перадаць Супрасльскай акадэміі, каб як найбольш людзей магло іх паглядзець. Пакуль што заснаваў я сваю інтэрнэнтую старонку: www.chram.com.pl, дзе змясціў больш за восемсот паштовак, каб людзі маглі іх пабачыць. Я гатовы іх сканіраваць, пазычаць, публікаваць і не патрабую за гэта грошай. Мро-



рунак кнігу аб цэрквах паўднёвай Польшчы. Я паглядзеў яе і звочыў такую самую браму, якая была перад царквой, якой я не мог распазнаць на купленай мною паштоўцы.

Цэны царкоўных паштовак на аўкцыёнах вагаюцца ад 1 да 100 еўра, а нават і больш.

— „Прайграў" я на інтэрнэтным аўкцыёне царкву ў Васількаве. Паставіў 80 еўра, а хтосьці перабіў мяне і даў 88,50 еўра. Найбольшых, аднак, цэнаў дасягаюць паштоўкі з сінагогамі. Немцы, дарэчы, калі бачаць нейкі будынак храма, пішуць „Russische Sinagoge", пасля ставяць пытальнік ды дапісваюць „Russische Kirche". Так падпісаныя паштоўкі сягаюць цэнаў даводзячых да галавакружэння. Духоўная каштоўнасць такіх паштовак, усё ж, неацэнная. Найдаражэйшай па ўсіх прыкметах у маёй калекцыі, здаецца, з'яўляецца паштоўка з царквой святога Мікалая Цудатворцы, якая знаходзілася ля беластоцкай вуліцы Бэма, дзе цяпер стаяць гаражы. Гэта адзіны экземпляр; каштаваў мне 30 злотых, а цяпер варты ён тысячу або і больш злотых.

I працягваў:

— Сёння цэны паштовак усё ўзрастаюць. Вельмі шмат калекцыянераў паяіцца мне, каб так як у Беластоку ўзнікла галерэя пад небам, прыгадваючая аб'екты якіх ужо няма, каб у кожным горадзе ў месцах, у якіх ужо няма цэркваў паставіць табліцы на металёвых ножках з іх відам.

Спадарожнічаючы ў час вернісажу Аляксандру Сасне канцлер Супрасльскай акадэміі а. Уладзімір Місіюк сказаў „Ніве":

— Гледзячы на гэтыя цэрквы, прыгадваюцца мне Хельсінкі і царква пабудаваная таксама расіянамі. Стаіць яна там да сёння і паважаецца фінамі, дарэчы, побач лютэранскай кафедры. Ніхто там гэтага не сароміцца. Ніхто таксама не зруйнаваў помніка цару Аляксандру. Яны ведаюць, што гэта частка гісторыі фінскага народа.

Выстава адкрыта ў рамках VI Падляшскага фестывалю навукі і мастацтва. У Супрасльскай акадэміі на працягу некалькіх фестывальных дзён можна было таксама паслухаць дакладаў аб ролі літургічнага спеву ў царкве і сімволіцы, між іншым сімволіцы літургіі, аб іконе ў царкве, праваслаўнай духоўнасці ды пачуць канцэрт літургічных спеваў з супрасльскага ірмалогія. На жаль, пакуль выставу паштовак Аляксандра Сасны можна было глядзець толькі да канца мая.

## 08.06 – 14.06

**(22.03. – 20.04.)** Заўсёды памятай, пра што просіць у цябе партнёр — інакш палічыць, што для цябе з'яўляецца ён малаважным. Але не будзеш плакаць над паранёнымі пачуццямі. Засяродзься на тым, каб выкарыстаць трапляючыеся нагоды.

**(21.04. – 21.05.)** 10-14.06. не прадбачваецца поспех у сяброўствах і ў фінансах. Грошы, якія пазычыш камусьці, могуць да цябе не вярнуцца. Можаш згубіць каштоўную рэч. У пастаянных парах прыдалося б больш ініцыятывы.

**(22.05. – 22.06.)** 8-9.06. зварухнуцца з месца твае справы. 11-15.06. можаш мець клопаты з лёсам. Пільнуй сваіх інтарэсаў і не нервуйся. Калі ў тваёй шматгадовай пары будзе штосьці псавацца, справішся з гэтым.

**(22.06. – 23.07.)** 3-11.06. выкажашся незвычайным клопатам, прытым справішся з кожнай праблемай. Шмат сімпатыі ад атачэння. 9-13.06. не ўсё пойдзе па-твойму. Некаторыя рэчы прападуць назаўсёды.

**(24.07. – 23.08.)** 9-13.06. прачнуцца ў табе новыя сілы і адкрыюцца новыя магчымасці. Справішся таксама з рознымі нямогласцямі. 11-15.06. некаторыя справы могуць пачаць моцна ўскладняцца. Лёс можа цябе паддаць цяжкаму выпрабаванню. Старайся не панікаваць і нічога не рабі неабдумана.

**(24.08. – 23.09)** 10-14.06. прадбачваюцца канфлікты ў сям'і ды ў сужонстве. Каб з імі справіцца, размаўляй, а не загадвай! Яшчэ шмат прафесійных поспехаў.

**(24.09. – 23.10.)** 11-15.06. выкажашся асабліва рафінаваным густам, уражлівасцю, смакам. Варта выбрацца ў гэты час па абноўку ў адзежы. 10-14.06. з-за тваіх неадказных і неабдуманых паводзін можаш падвяргнуць спробе давер партнёра.

**(24.10. – 22.11.)** Сумачка, якую ты планаваў сабраць, акажацца большай чым планаваў. Ды неахвотна будзеш выдаваць грошы, хіба што трапіцца нерухомасць. 14.06. прачнецца ў табе аптымізм і ажывуць цудоўныя ўявы будучыні.

**(23.11. – 22.12.)** 8-9.06. асцерагайся рызыканцкіх фінансавых рашэнняў. У канцы тыдня ўбачыш увесь спектр сваіх магчымасцей. Быццам азарыць цябе, пакінуць цябе ўсе сумненні. 14.06. скажуць табе не раз, што лішне сур'ёзна ўспрымаеш жыццё.

**(23.12. – 20.01.)** 8-12.06. хтосьці рассее плёткі на тэму твайго партнёра. Цяжка будзе вярнуць надкрышаны давер. Добры настрой направіць пачуццё ўласнай красы, гумар і аптымізм.

**(21.01. – 19.02.)** 10-14.06. могуць цябе абмануць. Асцерагайся таксама нячыстай гульні ў каханні. Можа аказацца, што асоба, якую ты падчапіў, захопіцца табою больш чым ты хацеў. 11-15.06. эксцэнтрычныя паводзіны могуць давесці цябе да матэрыяльных страт.

**(20.02. – 21.03.)** 11-15.06. агорне цябе пачуццё бязмежнай любові да ўсяго свету. Будзеш мець фантастычны настрой! У канцы тыдня можаш сустрэць свайго анёла-ахоўніка або сам ім станеш для кагосьці. Добры час на духоўныя практыкі. Ахвоту перакрочыць усе бар'еры накіруй на мастацкую ці інтэлектуальную дзейнасць.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960